МОСКВА 19
УЛ. МАРКСА ЭНГЕЛЬСА 14
ВСЕСОЮЗНОЙ БИБЛИОТЕКИ
ИМ. ЛЕНИНА
1.12 38

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 26 (5700) | 2 лютага 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Аб рабоце Смілавіцкага і Круглянскага РВК, Дрычынскага і Камсініцкага сельсоветаў па ажыццяўленню сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі — Пастанова прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР.

Аб грубым парушэнні пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) па пытанню павышэння зарплаты настаўнікам і іншым школьным работнікам — Пастанова ўпаўнаважанага Камісіі партыйнага кантроля пры ЦК ВКП(б) па БССР.

Беларускі народ з захапленнем сустрэў праект Канстытуцыі БССР.

Артыкулы: Перадавы — Удзесяцярыць класавую пільнасць. **Мясніи** — Наладзіць работу па разгляду скаргаў. — **П. Чынун** — Там, дзе страцілі рэвалюцыйную пільнасць. **Шульман** — Рабочыя Беларускай чыгункі выкрываюць шкоднікаў. **Н. Вішнеўскі** — Кавалерысты.

Пахаванне М. Л. Палунова.

За граніцай: Наступленне рэспубліканскіх войск на паўночным фронце. Халасі — глава новага японскага ўрада. Прамова Гітлера ў германскім рэйхстагу. Водгукі за мяжой на прыгавор Вярхоўнага суда СССР.

БЕЛАРУСКІ НАРОД З ЗАХАПЛЕННЕМ СУСТРЭЎ ПРАЕКТ КАНСТЫТУЦЫІ БССР

Рабочыя менскага завода «Большэвік» пачалі абмеркаванне праекта Канстытуцыі БССР. НА ЗДЫМКУ: стаханаўка другога хромавага цэха тав. Вярыга чытае праект Канстытуцыі БССР рабочым свайго цэха. Фото Я. Салавейчыка.

УДЗЕСЯЦЯРЫЦЬ КЛАСАВУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

Беларускі народ, як і ўсе народы вялікага Совецкага Саюза, з задавальненнем і аднадушным адабрэннем сустрэў прыгавор Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР над трацкісцкай бандай забойцаў, шпіёнаў, дыверсантаў, здраднікаў радзімы, рэстаўратараў капіталізма.

З судовага працэса над зграяй трацкісцкіх бандытаў выцякае асноўны вывад, асноўная задача — вышэй рэвалюцыйную пільнасць, навучыцца распазнаваць ворага, якой-бы маскай ён ні прыкрываўся. Таварыш Сталін яшчэ некалькі гадоў таму назад папярэджваў, што няма такой пакасці і паклёпу, якія-б класавыя ворагі «не ўзвялі на совецкую ўладу». Ён папярэджваў, што «могуць ажыць і заварушыцца разбітыя групы старых контррэволюцыйных партый эсэраў, меншавікоў, буржуазных нацыяналістаў цэнтра і Украіны, могуць ажыць і заварушыцца асколкі контррэволюцыйных апазіцыйных элементаў з трацкістаў і правых ухілістаў. Гэта, вядома, не страшна. Але ўсё гэта трэба мець на ўвазе, калі мы хочам пакончыць з гэтымі элементамі быстра і без асаблівых афяр».

Якія празорлівыя і геніяльныя гэтыя словы правадыра нашага! Кіруючыся гэтым указаннем, партыя, выхаваная Леніным — Сталіным, папярэдзіла магчымыя вынікі подлай трацкісцкай контррэволюцыйнай зграі.

Намаганнямі нашай партыі вораг выкрыты, абязброены і разлаўлены. Гэта факт несумненны. Аднак, няправільна было-б адпачываць на лаўрах, асабліва нам, беларускім партыйным і непартыйным большэвікам. Ніколі мы не павінны забываць, што подлая банда пакінула свае сляды ў Беларусі. Факт-жа, што Розенблюм — паследыш трацкісцкай гадзіны — працаваў у Менску і прабываў утоіць тут прамога агента Троцкага — Ольберга. Ніколі нельга забываць нам прыгранічнае становішча рэспублікі, дзе вораг працуе ўсямерна, прабуючы паслабіць чыгунку, прамысловыя прадпрыемствы і калгасы, словам, усе краёвасці абароны БССР.

Трэба проста сказаць, што некаторыя партыйныя арганізацыі забыліся аб гэтым. Ёсць у нас і такія арганізацыі, якія шмат балбочуць аб пільнасці, выносяць рэзалюцыі і пастановы аб неабходнасці павышэння рэвалюцыйнай пільнасці, але ў той-жа час не стварылі такой сістэмы работы, якая закрыла-б усе шчыліны, перагарадзіла доступ ворагу ў нашы рады.

Нямала ў нас кіраўнікоў партыйных арганізацый, якія па-дзяляцку, захапіўшыся гаспадарчымі пытаннямі — прэнантамі выканання плана, гектарамі пасеву, тонамі загатоўленага збожжа, перастаюць быць палітычнымі кіраўнікамі ў раёне, на заводзе, не адчуваюць пульса палітычнага жыцця. Гэта-ж факт, што рад кіраўнікоў партыйных арганізацый — сакратары райкомаў і партакомаў самі займаюцца амаль выключна гаспадарчымі пытаннямі, а партыйную работу справу выхоўвання комуністаў, прапаганду і палітагітацыю перадаверяюць другарадным асобам. Ці не зразумела, што ў такой арганізацыі ніякі ідэйны ўзровень комуністаў, не адчуваецца баявога партыйнага жыцця, самакрытыка і праверка выканання ў загоне? Ці не зразумела, што іменна ў такіх партыйных арганізацыях, не гледзячы на шматлікую балбатню аб пільнасці, класавы вораг застаецца незаўважаным, ён арудуе беспакарана?

Сапраўднае ўзняцце большэвіцкай пільнасці немыслімо без сістэматычнай, грунтоўнай праверкі выканання. Нямала яшчэ ў нас людзей, якія выносяць дзесяткі пастаноў па аднаму і таму-ж пытанню, ні разу не правяраючы іх выканання. Не цяжка здагадацца пра сілу гэтых пастаноў і аўтарытэт арганізацый і кіраўнікоў, якія выносяць гэтыя пастановы.

«Добра пастаўленая праверка выканання, — гаварыў таварыш Сталін на XVII З'ездзе партыі, — гэта той пражэктар, які дапамагае асвятляць становішча работы апарата ў любы час і выводзіць на свет божы бюракратаў і канцылярыстаў. Можна з упэўненасцю сказаць, што 9/10 нашых прарэх і прарываў тлумачыцца адсутнасцю правільна пастаўленай праверкі выканання. Не можа быць сумнення, што пры наяўнасці такой праверкі выканання прарэхі і прарывы былі-б напэўна папярэджаны».

Падбор, вывучэнне і праверка кадраў не па анкетах, а па рабоце, па іх справах, па таму, як яны выконваюць дырэктывы партыі і ўрада, праверка не праз другарадных тэхнічных работнікаў, а непасрэдна самімі кіраўнікамі арганізацый — такі яшчэ адзін урок з судовага працэса над контррэволюцыйным трацкісцкім «паралельным цэнтрам».

Трэба пакончыць з манілаўшчынай, гнілым лібералізмам і благадушшам у партыйных арганізацыях. Час зразумець, што адзіны сапраўдны залог рэвалюцыйнай пільнасці — гэта далейшае павышэнне ідэйнай узброенасці ўсіх членаў і кандыдатаў партыі. Толькі павышэнне палітычнага ўзроўню кожнага комуніста, веданне партыйнай арганізацыяй кожнага члена партыі, яго палітычнага мінулага і сучаснага дапамогуць партыі своечасова распазнаць і ўскрыць усіх яшчэ невыкрытых ворагаў партыі і народу.

Народы Совецкага Саюза, знішчыўшы гнусную зграю лакеяў фашызма, сцэментаваны адзінай воляй, адзіным імкненнем і жаданнем ісці няўхільна пад сцягам новай Канстытуцыі па сталінскаму шляху. Яны спаяны велізарнай любоўю і адданасцю партыі Леніна — Сталіна, вялікаму правадыру народаў — любімаму **Сталіну.**

Беларускі народ з вялікім задавальненнем сустрэў апублікаванне праекта Канстытуцыі БССР, Канстытуцыі адроджанага вялікай социялістычнай рэволюцыяй народу. Ён поўны гатоўнасці адказаць на гэта вялікае справамі на фронце социялістычнага будаўніцтва, ён поўны рашучасці пільна ахоўваць свяшчэнныя межы вялікага Совецкага Саюза на заходнім рубяжы з капіталістычным светам.

Як зяніцу вока, як сцяг на полі бою совецкі народ ахоўвае і будзе ахоўваць жыццё сваіх правадыроў, вялікія завяванні социялізма. Няма такой сілы, якая магла-б знішчыць вялікі, свабодны і шчаслівы народ, кіруемы геніяльнай партыяй Леніна — Сталіна.

БУДЗЕМ ПАВЯЛІЧВАЦЬ БАГАЦЦІ НАШАЙ РЭСПУБЛІКІ

ПІСЬМО ДЭПУТАЦКАЙ ГРУПЫ І СТАХАНАЎЦАЎ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ ІМЯ КАГАНОВІЧА

Апублікаваны праект Канстытуцыі БССР з'яўляецца ярчэйшым дакументам таварыства ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. У гэтым дакуменце адлюстраваны велізарныя дасягненні нашай квітнеючай ордэнаноснай рэспублікі — неад'емнай часткі вялікага Совецкага Саюза. Гэтыя дасягненні, як і ўсе перамогі вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, замацаваны Сталінскай Канстытуцыяй Саюза ССР.

Беларускі народ, які пераносіў падвойны гнёт царскага самадзяржаўя і свае нацыянальнай буржуазіі, у выніку пераможнага ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі стаў роўнапраўным членам у вялікай свабоднай сям'і народаў Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Расце і мацнее прамысловасць і сельская гаспадарка. Павялічваюцца кадры сваёй уласнай інтэлігенцыі, павышаецца культурнасць і пісьменнасць насельніцтва. Беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць і зараз прымае сваю Канстытуцыю.

Здраднікі радзімы, дыверсанты, шпіёны і шкоднікі з трацкісцкай банды імкнуліся зноў вярнуць гнёт і пакуты нашаму народу, яны хацелі аддаць нашы заваёвы, нашу радзіму на распярзанне германскага фашызма і японскай ваеншчыны. Яны хацелі адабраць у нашага народу Сталінскую Канстытуцыю. Але яны пралічыліся. На варце вялікіх заваёў, замацаваных Сталінскай Канстытуцыяй, стаяць працоўныя ўсіх народаў Совецкага Саюза, у першых радах якіх знаходзіцца стальная кагорта чэкістаў на чале з саратнікам Сталіна тав. Ежовым. Яны заўсёды абяспечваюць вэрага, адкуль-бы ён ні пачкнуўся. Мы вітаем прыгавор Вярхоўнага суда, які з'яўляецца прыгаворам усяго народу.

На прошукі ворагаў радзімы мы адказваем паляпшэннем стаханаўскай работы, павышэннем пільнасці, умацаваннем абароннай работы, згуртаваннем сваіх радоў вакол ленінска-сталінскай партыі і вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

У адзнаку апублікавання праекта Канстытуцыі Беларускай ССР мы бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

Павялічаны вытворчы план супроць 1936 года на 25 проц. выканаць датэрмінова, выпусціўшы 2.348 тыс. пар абутку, захоўваючы пры гэтым асартымент і якасць. Давесці выпуск першагатуновага абутку да 89 проц. Выканаць заданне па прадукцыйнасці працы не толькі ў цэхах, але і ў натуральным выразе. Даць 6 мільёнаў дэцыметраў эканоміі верхняга скуртавару. Сабраць на працягу 1937 года не менш 300 рацыяналізатарскіх прапаноў. Разгарнуць социялістычнае спаборніцтва паміж цэхамі, групамі, агрэгатамі, брыгадамі і асобнымі рабочымі на лепшае выкананне ўзятых абавязацельстваў. Ахапіць здачай норм на значок ПІХА 1000 рабочых фабрыкі, на значкі варашылаўскіх стралкоў першай і другой ступені — 50, падрыхтаваць 100 інструктароў ПІХА, 10 парашутыстаў першай і другой ступені, 15 планерыстаў, 4 паветраных стралкі, 10 лётчыкаў без адрыву ад вытворчасці, 4 юных варашылаўскіх стралкоў, 6 снайпераў, 20 санітарных сяспёр, 100 значкістаў ГСА, 5 танкістаў.

Выклікаем на спаборніцтва дэпутацкія групы і стаханаўцаў швейнай фабрыкі «Кастрычнік» і скурзавода «Большэвік».

ЧЛЕНЫ ДЭПУТАЦКАЙ ГРУПЫ МЕНСКАЙ ФАБРЫКІ ІМЯ КАГАНОВІЧА: Дабравольскі, Кліорын, Баскін, Гітліц М. С., Аляксеева, Мілоў.

СТАХАНАЎЦЫ: Скабло Г., Скабло З., Розенберг, Сляпян, Фельдман, Чарапахіна, Чарноцкі, Ліпнер і інш.

З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ

ВІЦЕБСК, 1 лютага. (Спец. кар. «Звязды»). Сёння працоўныя Віцебска з вялікім натхненнем абмяркоўваюць апублікаваны ў друку праект Канстытуцыі БССР. Гэты гістарычны дакумент усюды сустракаецца з задавальненнем і захапленнем.

Тэхнічны дырэктар завода «Чырвоны металіст» імя Кірава т. Крыгель, дзелячыся ўражаннямі аб праекце Канстытуцыі, гаворыць:

— Як свабодны грамадзянін сваёй рэспублікі і актыўны ўдзельнік социялістычнага будаўніцтва, я ганаруся гэтым гістарычным дакументам, які адлюстроўвае вялікія завяёвы беларускага народу, здабытыя пад непасрэдным кіраўніцтвам нашай большэвіцкай партыі і дапамозе брацкіх рэспублік і ў першую чаргу РСФСР. Праект Канстытуцыі ёсць прамы рэзультат ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, трыумф генеральнай лініі нашай партыі.

Я сам — сын рабочага-слесара. Апрача эксплаатацыі, пакуты і галечы мой бацька нічога не ведаў. Аб атрыманні асветы ён і марыць не мог.

Што з сябе ўяўляе наша сям'я сёння? Я асабіста — у мінулым радавы слесар — сёння з'яўляюся тэхнічным кіраўніком аднаго з буйнейшых металургічных заводаў БССР. Па асвеце — тэхнік. Працуючы на заводзе, я адначасова займаюся ў віцебскім філіяле інстытута гаспадарнікаў. Брат вой Ілья скончыў кіеўскі політэхнічны інстытут і працуе інжынерам на адным з кіеўскіх заводаў. Сястра Геня скончыла планавы інстытут і працуе планавікам на менскім заводзе імя Варашылава. Другая сястра Надзя працуе бухгалтарам у наркамане сувязі. Усе мы атрымалі асвету пры совецкай уладзе. Бацька мой па старасці і па страце працаздольнасці атрымлівае пенсію.

Інжынер варштатабудаўнічага цэха Грынман Цыля Міхайлаўна расказвае:

— Бацька мой кравец-саматужнік, памёр у 1925 годзе. Жыццё саматужніка краўца-адзіночкі ў мінулым многім вядома. Яно — поўнае вечнай галечы. Прачытаўшы праект Канстытуцыі БССР, я сама сабе задаю пытанне, кім-бы я магла быць у дарэволюцыйны час, кім-бы я магла быць, калі-б у нас была не социялістычная, а буржуазная рэспубліка, і тут-жа адказваю: такой-жа беднай краўчыхай, як і мой бацька.

Я шчаслива тым, што нарадзілася за 4 гады да рэволюцыі і выхавалася ўжо пры совецкай уладзе. Совецкая ўлада дала мне пуцёўку ў сапраўднае шчаслівае і радаснае жыццё. У мінулым годзе я скончыла маскоўскі варштата-інструментальны інстытут. Зараз маю званне інжынера-механіка-тэхнолага. Усе мае сілы, усе веды я прыкладу на тое, каб апраўдаць ганаровае званне свабоднай грамадзянкі нашай любімай радзімы.

Начальнік кавальскага цэха інжынер Казлоўскі зварачае ўвагу на артыкул 108 праекта Канстытуцыі БССР, які гаворыць: «Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна БССР. Здрада радзіме: парушэнне прысягі, пераход на бок ворагаў, нанясенне шкоды ваеннай магутнасці дзяржавы, шпіянаж караюцца ва ўсёй строгасці закона, як самыя цяжкія злачынствы».

— Аднадушнае адабрэнне прыгавора Вярхоўнага суда над антысовецкім трацкісцкім цэнтрам 170-мільённым народам нашай краіны, — гаворыць т. Казлоўскі, — ёсць у той-жа час аднадушнае галасаванне за даны артыкул. За сваю радзіму, за Сталінскую Канстытуцыю, за Канстытуцыю нашай Беларускай рэспублікі я ў любую мінуту гатоў афяраваць сваім жыццём.

Ва ўсіх цэхах завода адбываецца масавая чытка праекта Канстытуцыі і перадавога артыкула «Звязды».

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Выступленне тав. ВАЛКОВІЧА на партыйным сходзе школы прапагандыстаў

81 студэнт на агульным партыйным сходзе Вышэйшай школы прапагандыстаў і кароткатэрміновых курсаў прапагандыстаў з абшырным двухгадзінным дакладам выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Валковіч.

У сваім дакладзе тав. Валковіч падрабязна інфармаваў прапагандыстаў аб чарговых задачах партыйных арганізацый КП(б)Б, а таксама спыніўся на палітычных выніках працэса над антысовецкім контррэволюцыйным трацкісцкім цэнтрам.

Пасля даклада тав. Валковіч гутарыў з прапагандыстамі па пытаннях вучобы і становішча партыйнай работы і даў рад практычных указанняў па палепшанню работы курсаў прапагандыстаў.

Павышэнне пенсій інвалідам грамадзянскай вайны і інвалідам з чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР павялічылі з 1 студзеня г. г. пенсіі інвалідам грамадзянскай вайны і інвалідам з ліку былых чырвонагвардзейцаў і чырвоных партызан да 40—65 руб. у месяц.

Адначасова павышаны размеры забеспячэння непрацаздольных членаў сем'яў указаных асоб і сем'яў памёршых удзельнікаў грамадзянскай вайны.

ВЕЧАР ТВОРЧАСЦІ А. С. ПУШКІНА

Пачаліся пушкінскія дні. 1 лютага ў Менску ў Дзяржаўным тэатры саюз совецкіх пісьменнікаў БССР правёў першы вечар, прысвечаны творчасці Александра Сергеевіча Пушкіна. Адкрываючы вечар, паэт А. Александровіч гаворыць пра тое, як шчаслівы совецкі народ ушаноўвае памяць вялікага рускага паэта, да якога ніколі «не зарастэт народная тропа».

Прафесар Я. А. Брантэйн на вечары зрабіў кароткі, але змястоўны даклад на тэму «Пушкін — вялікі рускі паэт».

Затым паэты БССР і артысты першага Беларускага дзяржаўнага тэатра чыталі творы Александра Сергеевіча на рускай, беларускай і яўрэйскай мовах.

Народны паэт рэспублікі Якуб Колас прачытаў урывак з «Палтавы», якую ён перакладае на беларускую мову. З выключным поспехам артыст Рахленка чытаў па беларускай мове ўрыўкі з паэмы А. С. Пушкіна «Медны коннік», якую перакладае народны паэт БССР Янка Купала, і рад вершаў на рускай мове. Паэты Андрэй Александровіч, Пятрусь Броўка, Мікола Хведаровіч і Пятро Глебка чыталі ўрыўкі і вершы ў перакладзе на беларускую мову.

Артыст Бірыла па-майстэрску прачытаў на рускай мове ўрыўкі з паэмы «Цыганы», а артыстка Ржэцкая ўрыўкі з паэмы «Руслан і Людміла» ў перакладзе на беларускую мову Андрэя Александровіча. Яўрэйскія паэты Ізі Харык, Эзлік Аксельрод, Тэйф і Камянецкі чыталі творы паэта на яўрэйскай мове.

Вечар паказаў, якая вялікая дружба народаў нашай краіны, як любяць усе народы дастойнага сына рускага народу вялікага паэта Александра Сергеевіча Пушкіна.

П. КАВАЛЕЎ.

ПАДХАПІЦЬ ЗАКЛІК РАБОЧЫХ ЗАВОДА „БОЛЬШЭВІК“

Лепшыя стаханаўцы менскага завода «Большэвік» лучшынышчык Екельчык і строгаль Запольскі, прачытаўшы праект Канстытуцыі БССР і даведаўшыся, што з 15 лютага будзе прадаўжаць работу Надзвычайны Усебеларускі З'езд Советаў звярнуліся да рабочага калектыва з прапановай адзначыць зацверджанне Канстытуцыі БССР новымі вытворчымі перамогамі.

Прапановы тт. Екельчыка і Запольскага горача падхоплены ўсімі рабочымі. У часе абедзеных перапынкаў 1 лютага ва ўсіх цэхах завода рабочыя і інжынерна-тэхнічны персанал, абмяркоўваючы праект Канстытуцыі, узялі персанальныя вытворчыя абавязацельствы. Няма ні аднаго ўчастка за заводзе, дзе не былі-б унесены рабочымі рацыяналізатарскія прапановы, не былі-б узяты павышаныя стаханаўскія нормы прадукцыйнасці працы.

1 лютага адбыўся агульназаводскі сход, на якім кожны цэх і асобныя брыгады дакладвалі, чым яны сустрэнуць зацверджанне Канстытуцыі БССР.

— Наша прапанова і абавязацельствы, — гаварыў на сходзе т. Запольскі, — выказалі наша шчырае жаданне паказаць, як высока можна ўзняць прадукцыйнасць працы, жывучы ў вольнай шчаслівай краіне социялізма.

— Беларусь была бяспраўнай царскай калоніяй, — гаварыў стаханавец другога хромавага цэха т. Капілевіч. — Абрабаваны прапоўны народ і ў марах не ўяўляў, што дасягне такога шчаслівага жыцця, якое мы маем сёння. Мы на прыкладзе нашага чырвонасцяжнага завода бачым, як далёка наперад шагнула ў супрапоўніцтве з брацкімі народамі наша краіна.

Па прапанове стаханаўцаў агульназаводскі сход прыняў зварот да рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых усіх прадпрыемстваў і чыгуначнага транспарту ордэнаноснай БССР.

«Праект Канстытуцыі БССР, — гаворыцца ў звароце — з'яўляецца гістарычным дакументам, які падводзіць вынік сусветна-гістарычным заваёвам социялізма ў БССР. Нашы заваёвы з'яўляюцца паказальнікам таго, як упершыню ў гісторыі чалавецтва былая адсталая царская калонія пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі ператварылася ў квітнеючую социялістычную рэспубліку.

Праект Канстытуцыі БССР публікуецца ў момант, калі працоўныя БССР разам з працоўнымі ўсіх народаў Совецкага Саюза выражаюць свой гнеў і нянавісць да банды трацкісцкіх забойцаў, дыверсантаў, тэрарыстаў, здраднікаў радзімы, пакараных па заслугах пролетарскім судом. Гэтыя агідныя мярзотнікі, агенты фашызма і на нашым заводзе тварылі свае контррэволюцыйныя справы. Усё гэта патрабуе ад нас усямернага павышэння рэволюцыйнай большэвіцкай пільнасці ва ўсёй нашай рабоце.

Праект Канстытуцыі БССР выклікае новы ўздым социялістычнага спаборніцтва на нашым прадпрыемстве».

Сустракаючы З'езд Советаў, рабочы калектыў завода абавязаўся перавыканаць план за першую палову лютага не менш, чым на 5 проц. па хрому і 15 проц. па адходнаму клею, асвоіць 6 машынак па дзёрганню шчаціны, узняўшы прадукцыйнасць працы на 50 проц., асвоіць і забяспечыць выпуск новай прадукцыі абуткова і галантарэйнага лаку.

Завод павялічвае асартымент і колькасць расцэтак абуткова і галантарэйнага тавару, будуе і пускае ў ход механізаваную глянцовачную сушку скур, узнімае якасць прадукцыі.

Рабочыя завода асобна зварачаюцца да чыгуначнікаў менскага чыгуначнага вузла з прапановай арганізаваць спаборніцтва на разгортванне стаханаўска-крываносаўскіх метадаў работы, на арганізацыю абмену вопытам паміж лепшымі стаханаўцамі, на ператварэнне менскага чыгуначнага вузла ў надзейную крэпасць абароны, ва ўзорны чыгуначны вузел БССР.

— Мы выражаем цвёрдую ўпэўненасць, заканчваецца зварот, — што новая Канстытуцыя БССР выкліча сярод працоўных новы ўздым энтузіязма і вытворчай актыўнасці, узніме рэволюцыйную пільнасць і яшчэ цясней згуртуе беларускі народ вакол нашай роднай большэвіцкай партыі, вакол нашага роднага бацькі, настаўніка і друга таварыша Сталіна, пад мудрым кіраўніцтвам якога пойдзем да новых перамог, да комунізма.

АБ ВЫВУЧЭННІ КАНСТЫТУЦЫІ САЮЗА ССР У ШКОЛАХ

1 лютага г.г. старшынёй Соўнаркома Саюза ССР тав. В. М. Молатавым даны наступныя тэлеграфныя ўказанні старшыням соўнаркомаў саюзных рэспублік:

«У мэтах вывучэння асноў совецкага ладу вучнёўскай моладдзю, якая рыхтуецца стаць у рады свядомых і актыўных будаўнікоў социялістычнага грамадства, Соўнарком Саюза ССР прапануе соўнаркомам саюзных рэспублік:

1. Арганізаваць на працягу застаўшагася перыяду 1936—1937 навучальнага года падрабязнае азнаямленне з новай Канстытуцыяй Саюза ССР вучняў 7, 8, 9 і 10 класаў сярэдніх школ.

2. З 1937—38 навучальнага года ўвесці выкладанне Канстытуцыі Саюза ССР у якасці самастойнага прадмета ў 7 класе сярэдняй школы». (БЕЛТА)

ВЫКЛІК НА СПАБОРНІЦТВА

Данае мною абавязацельства таварышу **Сталіну** на 1-й Усесаюзнай нарадзе перадавікоў жывёлагадоўлі — надаіць 4 тысячы літраў ад кожнай каровы сваёй групы я выканала. На 1 студзеня 1937 года надаіла ад кожнай каровы сваёй групы па 4200 літраў малака.

У адказ на тэлеграму таварыша **Гінало** даярны-ордэнаносцы т. Каўзэрка М. і на пісьмо наркамсоўгасаў тав. **Калмановіча** і начальніка палітвіраўніцтва Наркамсоўгасаў тав. **Сомса** аб разгортванні стаханаўскага руху і социялістычнага спаборніцтва, я бяру на сябе абавязацельства:

У 1937 годзе надаіць ад кожнай каровы сваёй групы па 4500 літраў малака. Адначасова абавязваюся навучыць сваім метадам работы стаханаўку нашага соўгаса тав. Хлодзінскую.

Выклікаю на социялістычнае спаборніцтва ўсіх даярак малочна-мясных соўгасаў БССР.

Даярка-ордэнаноска племгаса Крынкі, Лёзнянскага раёна, БАШКІРАВА.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ВЫКАНАНА

Дэлегатка Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Советаў, стаханаўка віцебскага дражджавога завода Фаня Кандыба ў пісьме на імя старшыні ЦВК БССР тав. Чарвякова паведамляе, што данае ёю абяцанне давесці план упакоўкі дражджэй да дзесяці тон выканана. 21 студзеня тав. Кандыба ўпакавала 10 тон і 32 кілограмы. Зараз яна прымае меры к таму, каб усе рабочыя цэха працавалі па яе метаду.

***

У пісьме на імя т. Кандыба тав. Чарвякоў адказаў:

Высокае званне дэлегаткі XII З'езда Советаў БССР Вы апраўдалі сваёй стаханаўскай работай. Прымце меры к усебаковаму абмеркаванню праекта Канстытуцыі БССР усімі рабочымі завода, у рэзультаце чаго ўсе пэхі завода павінны стаць стаханаўскімі. Усе заўвагі, дадаткі і змены Канстытуцыі збярыце і прывязіце 15 лютага на Надзвычайны З'езд Советаў.

ПРАМОВА ГІТЛЕРА Ў ГЕРМАНСКІМ РЭЙХСТАГУ

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 30 студзеня. (БЕЛТА). Назначаныя на сёння парадныя цэрэміоніі з прычыны 4-гадовага прабывання фашыстаў ва ўладзе насілі больш бледны характар, чым чакалася. Калі не лічыць звычайнай вулічнай шуміхі, знадворным выражэннем іх з'явіўся дождж рознастайных назначэнняў, павышэнняў у чынах і іншых узнагарод па арміі, паліцыі і фашысцкай партыі. Ганаровыя тытулы прысвоены таксама раду блізкіх фашызму мастакоў і акторaў.

Стрыжнем, як звычайна, у падобных выпадках, з'явілася пасяджэнне рэйхстага, аб якім успомнілі з нагоды выпадку. Трэба адзначыць, што берлінскім карэспандэнтам ТАСС і «Правды» было адмоўлена ва ўходным білеце на пасяджэнне рэйхстага.

На працягу двух мінут рэйхстаг «правярнуў» усе неабходныя фармальнасці. Яшчэ тры мінуты заняло прыняцце закона аб прадоўжанні на 4-гадовы тэрмін надзвычайных поўнамоцтваў урада. Затым з двухгадзіннай прамовай аб замежнай і ўнутранай палітыцы Германіі выступіў Гітлер.

Гітлер заявіў, што праводзімы Германіяй метад аднабаковага разрыву дагавораў, на яго думку, «аблягчыў другому боку немінучае прыняцце гэтых крокаў». Адказваючы англійскаму міністру замежных спраў Ідэну, указаўшаму, што германскі ўрад сваёй палітыкай вядзе Германію да ізаляцыі, Гітлер заявіў, што Германія не адчувае сябе ізаляванай. У пацверджанне Гітлер прывёў дагаворы, заключаныя Германіяй з Польшчай, Аўстрыяй і Італіяй, а таксама «прыязныя» адносіны да Венгрыі, Югаславіі, Балгарыі, Грэцыі, Партугаліі і... да Іспаніі!

Гітлер указаў у гэтай сувязі таксама на «антыкамінтэрнаўскае» германа-японскае пагадненне.

Гітлер паўтарыў свае старыя нападкі на большэвізм, які «хоча навязаць сваё панаванне ўсім народам», і паправаў ідэю, што той не хоча гэтага бачыць. Закранаючы адносіны з Совецкім Саюзам, Гітлер заявіў, што Германія не мае намеру пашырыць дагаворныя адносіны з СССР.

Пераходзячы да пытання аб раззбраенні, узнятага ў прамове ідэю, Гітлер заявіў, што «вызначэнне размеру неабходных для абароны Германіі ўзбраенняў належыць германскаму народу і будзе вырашацца толькі ў Берліне».

Закранаючы пытанне наконт Лігі нацый, Гітлер указаў, што за апошнія стагоддзе ў Еўропе вырас рад новых нацый, раней не адыгрываўшых ніякай ролі. Да гэтых нацый Гітлер аднёс «новую Італію», Германію, Польшчу і Балканы. Пры гэтым агульную ўвагу звярнуў на сябе той факт, што Гітлер не ўпамянуў аб Чэхаславакіі. Гітлер спыніўся таксама на пытанні аб звароце Германіі калоній. Пры гэтым ён зноў паўтарыў даўно вядомыя аргументы і заканчыў наступнай заявай: «Так, патрабаванне калоній для нашай перанаселенай краіны, само сабой разумеецца, будзе ўзнімацца ўсё зноў і зноў».

***

БЕРЛІН, 31 студзеня. (БЕЛТА). З заключным словам перад закрыццём пасяджэння рэйхстага выступіў старшыня рэйхстага — германскі міністр авіяцыі Герынг. У сваёй прамове ён імкнуўся абвергнуць сувязь германскіх фашыстаў з Троцкім, выкрытую на працэсе антысовецкага трацкісцкага цэнтра. «Абвяржэнні» Герынга складаліся з раду галаслоўных сцвярджэнняў і антысовецкіх выпадаў.

Затым Герынг перайшоў да пытання аб прысуджэнні Нобелеўскай прэміі міру германскаму антыфашысцкаму публіцысту Карлу Осецкаму і, не называючы яго па прозвішчу, разразіўся лаянкай па яго адрасу. Пасля гэтага Герынг прачытаў новае распараджэнне Гітлера, якое забараняе германскім падданым прымаць Нобелеўскую прэмію.

***

БЕРЛІН, 31 студзеня. (БЕЛТА). Учора, пасля пасяджэння рэйхстага, адбылося ўрачыстае пасяджэнне германскага габінета, на якім Гітлер дзякаваў міністрам за «за поспехі і вернасць» і аб'явіў аб прыёме ў фашысцкую партыю ўсіх членаў урада. Як вядома, некаторыя з іх, напрыклад, ваенны міністр Бломберг, міністр замежных спраў Нейрат і іншыя да гэтага часу не лічыліся членамі фашысцкай партыі.

Водгукі на дэкларацыю Гітлера

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі, месца-прабыванне Лігі нацый), 31 студзеня. (БЕЛТА). У колах Лігі нацый адзначаюць, што прамова Гітлера сваім астрыём накіравана цалкам супроць Англіі, калі не лічыць звычайных і ўжо ўсім надакучыўшых выпадаў супроць СССР.

«Гітлер прапануе англічанам выбіраць: або вайну за страчаныя германскія калоніі, або вольныя рукі для Германіі ў вайне на Ўсходзе» — так каментуюць прамову Гітлера ў палітычных колах Жэневы.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 31 студзеня. (БЕЛТА). Газеты холадна каментуюць прамову Гітлера, не скрываючы трывогі па поваду змешчаных у гэтай прамове скрытых пагроз і неламовак па раду пунктаў еўрапейскай палітыкі.

Газеты падкрэсліваюць, што прамова Гітлера не дае ніякай базы для новых перагавораў. Пярэчанні Гітлера супроць супрацоўніцтва з Совецкім Саюзам устраняюць Германію ад усякага ўдзелу ў агульным уміратваранні Еўропы. Друк адзначае таксама непакой, выкліканы поўным маўчаннем Гітлера аб пазіцыі германскага ўрада ў адносінах Чэхаславакіі.

Усеагульны пратэст выклікае заява Гітлера аб каланіяльных дамаганнях Германіі.

Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі

НА ЗДЫМКУ: байцы ўрадавых войск рыхтуюцца да атакі ў Каса дэль Кампо на мадрыдскім фронце. (СФ).

УСЕ АТАКІ МЯЦЕЖНІКАЎ АДБІТЫ

БАРСЕЛОНА (сталіца Каталонскай аўтаномнай вобласці), 31 студзеня. (БЕЛТА). На мадрыдскім фронце атакі, прадпрынятыя мяцежнікамі на працягу папярэдняй ночы ў напрамку Заходняга парка, былі адбіты.

Старшыня камітэта абароны Мадрыда генерал Міаха заявіў, што ўрадавыя войскі моцна ўтрымліваюць свае пазіцыі, маючы задзанне адбіваць атакі мяцежнікаў. Наступленне рэспубліканцаў будзе ажыццёўлена падрыхтоўваемай новай арміяй.

На працягу апошняга тыдня ў сектары Кардовы (паўднёвы фронт) ініцыятыва поўнасцю перайшла ў рукі ўрадавых войск.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 31 студзеня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас з Мадрыда, страты, панесеныя мяцежнікамі ў часе ўчарашняга бою ў сектары Аранхуэса (на поўдзень ад Мадрыда), складаюць каля тысячы забітых і раненых.

Наступленне рэспубліканскіх войск на паўночным фронце

БІЛЬБАО (сталіца Баскскай аўтаномнай вобласці), 31 студзеня. (БЕЛТА). На біскайскім фронце сёння рэспубліканскія войскі атакавалі пазіцыі мяцежнікаў у раёнах Маркіна, Эйбар і Ордунья. У раёне Маркіна мяцежнікі ў рэзультаце нечаканай атакі ўціклі ў паніцы, пакінуўшы шмат ручных гранат, дзве скрынкі патронаў і вялікую колькасць фартыфікацыйнага матэрыялу. У раёне Эйбар мяцежнікі аказалі вялікае супраціўленне ўрадавым войскам, але пасля доўгага бою вымушаны былі адступіць і панеслі вялікія страты. Рэспубліканская артылерыя разбурыла ўмацаванні мяцежнікаў на ўзвышшы Каламуа (на ўсход ад Эйбара) і ўзарвала парахавы пограб мяцежнікаў. У рэзультаце ўзрыву са строю выведзена вялікая колькасць салдат.

На астурыйскім фронце сёння на світанні атрад рэспубліканскіх войск непрыкметна ўвайшоў у горад Овіедо, дайшоў да плошчы Пласо дэ Торас, захапіў у мяцежнікаў некалькі вінтовак, ручных гранат, а таксама харчаванне і без страт вярнуўся на свае пазіцыі.

Германскія інтэрвенты страцілі 119 самалётаў

МАДРЫД, 24 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Фабра, страты германскай авіяцыі на франтах грамадзянскай вайны ў Іспаніі вельмі вялікія. Увогуле Германія страціла 119 самалётаў, пераважна «Гейнкелей». Германскіх лётчыкаў, бортмеханікаў і т. д. загінула 243 чал.

УРАДАВЫ КРЫЗІС Ў ЯПОНІІ

ХАЯСІ—ГЛАВА НОВАГА ЎРАДА

ТОКІО (сталіца Японіі), 29 студзеня. (БЕЛТА). Японскі імператар даручыў сфарміраванне габінета Хаясі. Хаясі прыняў даручэнне.

Хаясі быў ваенным міністрам ва ўрадзе Сайто і Окада. З верасня 1935 года ён вышаў у адстаўку, пасучы адказнасць за забойства былога начальніка ваеннага аддзела ваеннага міністэрства Нагата.

Хаясі, будучы камандуючым японскімі войскамі ў Карэі ў часе ўзнікнення «манчжурскага інцыдэнта» 1931 года (японская акупацыя Манчжурыі), па ўласнай ініцыятыве накіраваў у Манчжурыю частку японскіх войск, якія знаходзіліся ў Карэі, для супрацоўніцтва з квантунскай арміяй (японская армія ў Манчжурыі).

***

ТОКІО, 30 студзеня. (БЕЛТА). Згодна агульнай ацэнкі друку ў палітычных колах і ў дзелавым свеце Японіі даручэнне Хаясі сфарміраваць новы габінет сустрэта «са змешаным пачуццём», прычым пераважае песімізм і вядомае расчараванне.

Галоўная прычына расчаравання ў тым, — пішуць газеты, — што ўрад Хаясі прыходзіць да ўлады ў рэзультаце поўнай перамогі ваенных улад у барацьбе вакол стварэння габінета Угакі. Такім чынам, не гледзячы «на асабістыя якасці Хаясі», новы ўрад, прыбліжаючыся па свайму тыпу да ваеннага ўрада, відаць, будзе садзейнічаць узмацненню тэндэнцыі фашызацыі з усімі вынікаючымі адсюль вынікамі ва ўнутранай і замежнай палітыцы.

Паводле слоў газет, выбар Хаясі ў якасці прэм'ера «азначае задавальненне жадання арміі, якая высоўвала Хаясі ў якасці галоўнага кандыдата».

У ваенных колах, — як паведамляюць газеты «Ніці-ніці» і «Асахі», — вельмі задаволены назначэннем Хаясі і ўпэўнены, што яго ўрад ажыццёвіць назеі ваенных улад.

ЛЁС КАМАНДЫ ПАРАХОДА „КОМСОМОЛ"

ПАРЫЖ, 31 студзеня. (Інф. «Праўды»). Згодна вестак, заслугоўваючых давер'я, команда парахода «Комсомол», патопленага іспанскімі мяцежнікамі ў Міжземным моры, знаходзіцца ў сучасны момант у гор. Кадыксе (горад на паўднёвым захадзе Іспаніі) у турме.

Пры патапленні «Комсомола», як перадаюць, яго команда была ўзята на крэйсер «Канарыяс», дастаўлена ў Кадыкс і пасаджана ў турму.

Мяцежнікі прымаюць усе меры, каб захаваць гэты факт ад грамадскай думкі.

ХРОНІКА

Асуджаныя Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра — Пятакоў Г. Л., Серэбракоў Л. П., Муралаў Н. І., Дробніс Я. Н., Шэстоў А. А., Пушын Г. Е., Ратайчак С. А., Багуслаўскі М. С., Турок І. Д., Грашэ І. І., Ліўшыц Я. А., Норкін Б. О. Князеў І. А. — звярнуліся 30 студзеня 1937 года ў прэзідыум ЦВК СССР з хадайніцтвам аб памілаванні.

У сваім пасяджанні ад 31 студзеня г. г. прэзідыум ЦВК СССР халайніцтва ўсіх асуджаных аб памілаванні адхіліў.

***

Учора, 1 лютага 1937 года, прыведзен у выкананне прыгавор Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР ад 30 студзеня 1937 года аб расстрэле асуджаных па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра — Пятакова Г. Л., Серэбракова Л. П., Муралава Н. І., Дробніса Я. Н., Ліўшыца Я. А., Багуслаўскага М. С., Князева І. А., Ратайчака С. А., Норкіна Б. О., Шэстова А. А., Турок І. Д., Пушына Г. Е. і Грашэ І. І.

(БЕЛТА).

АБ РАБОЦЕ СМІЛАВІЦКАГА І КРУГЛЯНСКАГА РВК, ДРЫЧЫНСКАГА І КАМСІНІЦКАГА СЕЛЬСОВЕТАЎ ПА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЮ СТАЛІНСКАГА СТАТУТА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ АРЦЕЛІ

Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР

Заслухаўшы даклады старшынь Смілавіцкага РВК тав. Жукоўскага і Круглянскага РВК тав. Жука, старшыні Дрычынскага сельсовета тав. Жука і нам. старшыні Камсініцкага сельсовета тав. Зубчэнка, старшынь калгасаў «Новы Дрычын» тав. Андросік і «Комуністычны шлях» т. Польскага «Аб рабоце па ажыццяўленню сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі» і суддаклады інструктароў тт. Сцяпанавай і Рыбакова, — Прэзідыум ЦВК БССР адзначае наступныя недахопы і парушэнні па выкананню статута сельскагаспадарчай арцелі ў паказаных раёнах і сельсоветах:

а) масавыя накладанні незаконных штрафаў, не звязаных з парушэннем калгаснай дысцыпліны (па калгасу імя Молатава, Сіманоўскага сельсовета, Круглянскага раёна, аштрафавана 66 калгаснікаў за патраву);

б) грубае парушэнне калгаснай дэмакратыі — ігнараванне агульных сходаў і падмена іх праўленнямі і старшынямі калгасаў («Комуністычны шлях», «Чапаеў»—Паўлаўскага сельсовета; «Новыя Маргі» і «Новы Дрычын», Дрычынскага сельсовета);

в) адсутнасць барацьбы за павышэнне ўраджайнасці, нездавальняючае становішча з павышэннем прадукцыі кваліфікацыі калгаснікаў;

г) грубае парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі ў радзе калгасаў Смілавіцкага і Круглянскага раёнаў у частцы землекарыстання калгасаў («Новы Дрычын», «Комуністычны шлях», «Чапаеў» і інш.);

д) у цэлым радзе калгасаў не выконваецца 14 пункт статута сельскагаспадарчай арцелі па своечасоваму прадастаўленню адпачынку цяжарным жанчынам;

е) з прычыны бяздзейнасці МТС, праўленняў калгасаў і рэвізійных камісій калгасаў, у калгасах адсутнічае барацьба за захаванне сацыялістычнай маемасці і супроць разбазарвання калгасных прадуктаў асобамі, якія не маюць ніякага дачынення да калгасаў («Комуністычны шлях», «Новы Дрычын» і інш.);

ж) райза, МТС і праўленні калгасаў не ведаюць работы перадавых брыгад і стаханаўцаў, дабіўшыхся лепшых паказальнікаў ураджайнасці, не адзначаюць работы стаханаўцаў павышэннем аплаты іх працадня і не перадаюць вопыту работы стаханаўцаў і перадавых брыгад у адстаючыя калгасы і брыгады;

з) у калгасах Дрычынскага і Камсініцкага сельсоветаў не ўсе калгаснікі ведаюць статут сельскагаспадарчай арцелі, статут не размножаны і не раздан калгаснікам.

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР адзначае грубае парушэнне дырэктыў партыі і ўрада Круглянскім РВК па рэгістрацыі статута сельскагаспадарчай арцелі і выдачы дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй калгасам.

Выяўлена, што па віне прэзідыума РВК і райза яшчэ і дагэтуль калгасы «Новае жыццё», Камсініцкага сельсовета і «Беларусь», Шэпялеўскага сельсовета, не атрымалі ад РВК статутаў, калгас імя Куйбышэва не атрымаў акта на вечнае карыстанне зямлёй, а таксама выяўлена, што прэзідыум Круглянскага РВК даручыў уручэнне акта тэхнічным работнікам (калгасу «Совецкая Беларусь» уручан акт рахункаводам сельсовета).

Смілавіцкі і Круглянскі райвыканкомы не зразумелі ўсёй важнасці работы секцый і дэпутацкіх груп, як масавых органаў советаў і не вядуць барацьбы за арганізацыю іх работы, у выніку чаго секцыі пры сельсоветах наогул і секцыі паляводчыя і жывёлагадоўчыя ў прыватнасці існуюць фармальна і па сутнасці не працуюць.

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР пастанаўляе:

1. Работу Круглянскага і Смілавіцкага РВК і сельсоветаў гэтых раёнаў па кіраўніцтву калгасамі прызнаць нездавальняючай.

2. Прыняць да ведама заяву старшыні Смілавіцкага РВК т. Жукоўскага, што меўшыя месца факты разбазарвання калгаснай сенажаці ў радзе калгасаў раёна ім выпраўлены.

3. За грубае парушэнне статута Камсініцкім сельсоветам, якое выразілася ў тым, што сельсавет браў рабочую цягавую сілу з калгасаў на пабудову будынка пад сельсавет не за плату, а за працадні калгасаў (250 працадзён),—прэзідыуму Камсініцкага сельсовета абвясціць вымову.

Абавязаць РВК у тэрміновым парадку аплаціць калгасам грашыма за патрачаныя імі працадні на будаўніцтве памяшкання сельсовета.

Абавязаць асабіста старшыню Круглянскага РВК т. Жука разглумачыць калгаснікам аб меўшых месца парушэннях статута сельскагаспадарчай арцелі Камсініцкім сельсоветам і праверыць, каб падобных выпадкаў не было ў іншых сельсоветах.

4. Улічваючы тое, што па калгасу «Комуністычны шлях», Паўлаўскага сельсовета, праўленне калгаса і рэўкамісія бяздзейнічалі, у выніку чаго разбазарванне і раскрадання калгаснай маёмасці праходзіла без пакарання, а таксама старшыня калгаса «Комуністычны шлях» тав. Польскі сам асабіста растраціў калгасныя грошы ў суме 1536 рублёў, на якіх няма ніякіх апраўдальных дакументаў, даручыць пракурору Круглянскага раёна праверыць факты разбазарвання сацыялістычнай маемасці і расходвання калгасных грошай і вінаватых прыцягнуць да адказнасці.

5. Абавязаць старшынь РВК: Смілавіцкага—т. Жукоўскага, Круглянскага—тав. Жука арганізаваць работу секцый і дэпутацкіх груп пры сельсоветах, сістэматычна заслухоўваючы на прэзідыумах РВК даклады аб становішчы работы асобных секцый і дэпутацкіх груп, устанавіўшы сталы кантроль за работай аддзелаў РВК па кіраўніцтву і дапамозе ў рабоце секцый і дэпутацкіх груп, арганізаваўшы работу секцый і дэпутацкіх груп так, каб яны сапраўды з'яўляліся масавымі органамі советаў.

6. Абавязаць старшынь Круглянскага РВК т. Жука і Смілавіцкага РВК т. Жукоўскага меўшыя месца факты грубага парушэння статута сельскагаспадарчай арцелі абмеркаваць на бліжэйшым пасяджэнні РВК і пашыраных пленумах сельсоветаў сваіх раёнаў, мабілізаваўшы ўсе советы і калгасы на большэвіцкае правядзенне ў жыццё статута сельскагаспадарчай арцелі і на барацьбу з парушэннямі статута. РВК прыняць меры па забеспячэнню кожнага калгасніка статутам сельскагаспадарчай арцелі свайго калгаса і арганізаваць работу па дакладнаму яго вывучэнню.

7. Даручыць усім старшыням РВК, райза, МТС праверыць у сельсоветах па кожнаму калгасу выкананне статута сельскагаспадарчай арцелі і выяўленыя недахопы ставіць на абмеркаванне агульных сходаў калгаснікаў, укараняючы ў свядомасць кожнага калгасніка і калгасніцы неабходнасць выканання статута сельскагаспадарчай арцелі і мабілізуючы іх на павышэнне працдысцыпліны, разгортванне соцспаборніцтва і ўдарніцтва і на гаспадарчае ўмацаванне калгасаў.

8. Лічачы нецярпімым фармальныя і безадказныя адносіны Смілавіцкай і Круглянскай МТС да абслугоўвання імі калгасаў, даручыць Наркамзему БССР праверыць работу гэтых МТС, увязку іх работы з райза і прыняць неабходныя захады па паляпшэнню іх работы.

9. Даручыць арганізацыі прэзідыума ЦВК БССР выкананне гэтай пастановы праверыць праз тры месяцы і далажыць прэзідыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

АБ ГРУБЫМ ПАРУШЭННІ ПАСТАНОВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) ПА ПЫТАННЮ ПАВЫШЭННЯ ЗАРПЛАТЫ НАСТАЎНІКАМ І ІНШЫМ ШКОЛЬНЫМ РАБОТНІКАМ

Пастанова ўпаўнаважанага Камісіі партыйнага кантроля пры ЦК ВКП(б) па БССР

Спецыяльнай праверкай, сумесна з ЦК саюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, устаноўлена, што па раду раёнаў (Полацкаму, Лёзнянскаму, Старобінскаму і т. д.) груба парушаецца пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб тарыфікацыі і вылічэнні зарплаты настаўнікам, дырэктарам і загадчыкам школамі. У рэзультаце гэтага ёсць многа выпадкаў, калі пры ўстанаўленні ставак і вылічэнні зарплаты аблічваюць настаўнікаў, а з другога боку, незаконна павышаецца зарплата некаторым настаўнікам і дырэктарам школ, прыняўшая ў некаторых раёнах масавы характар з фактамі яўнага рвацтва і злоўжываванняў.

Асабліва нецярпімае становішча мела месца па Полацкаму раёну (загадчык райана т. Іофе), дзе па праверaных школах выкрыта да 20 выпадкаў аблічванняў настаўнікаў на агульную суму (арыентовачна з 1 красавіка 1936 г. па 1 студзеня 1937 г.) больш 3 тысяч рублёў, а таксама каля ста выпадкаў незаконнага павышэння зарплаты, у рэзультаце якіх за гэты-ж перыяд часу перавыдаткавана дзяржаўных сродкаў больш 30 тысяч рублёў. Незаконнае павышэнне зарплаты ў гэтым раёне прыняло такі характар, што дырэктар 13 і 18 школ Красоўскі (член партыі) па абодвух школах, асабіста прадстаўляючы ведамасці ў райана, пераатрымліваў штомесячна каля 1.000 руб., з якіх 447 руб. у месяц незаконна атрымліваў сам, а астатнія пераплачваў іншым работнікам сваіх школ. Амаль аналагічнае становішча мела месца і па іншых школах Полацкага раёна і горада (9-я школа, горанская НСШ і т. д.).

Усё гэта з'явілася рэзультатам таго, што зусім чоткія ўказанні СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб дакладным і своечасовым правядзенні тарыфікацыі настаўнікаў з боку раду райана, асабліва Полацкага, не выкананы, а Наркамасветы рэспублікі не аказаў дапамогі райана і не ўстанавіў адпаведнага кантролю за ходам выканання гэтай важнейшай пастановы.

Выходзячы з гэтага, упаўнаважаны КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР пастанаўляе:

1. Звярнуць увагу Наркамасветы тав. Дзякава на недапушчальнасць такога становішча, калі райана ў большасці выпадкаў у пытанні тарыфікацыі настаўнікаў прадастаўлены самім сабе ў рэзультаце адсутнасці аператыўнага кіраўніцтва, кантролю і дапамогі ў гэтай рабоце з боку Наркамасветы.

Прапанаваць Наркамасветы, на аснове існуючых матэрыялаў па Полацкаму, Лёзнянскаму, Старобінскаму і іншых раёнах, прыняць меры к выпраўленню дапушчаных парушэнняў пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) з тым, каб тарыфікацыя настаўнікаў была праведзена ў дакладнай адпаведнасці з указанай пастановай.

2. Загадчыку Полацкага райана тав. Іофе за безадказныя адносіны да пытання тарыфікацыі настаўнікаў і адсутнасць кантролю ў гэтай справе за дырэктарамі і загадчыкамі школамі — абвясціць вымову. Прапанаваць тав. Іофе на працягу двух дэкад правесці тарыфікацыю настаўнікаў па гор. Полацку і раёну, а Наркамасветы БССР прасачыць за выкананнем гэтага ўказання і выслаць па месца свайго прадстаўніка для аказання дапамогі ў гэтай рабоце.

3. Дырэктару 13 і 18 школ тав. Красоўскаму (член партыі з 1932 г.) за праяўленае злоўжыванне і рвацтва — свавольнае павышэнне сабе і іншым работнікам сваіх школ ставак зарплаты, чым груба парушыў пастанову СНК і ЦК, — абвясціць суровую вымову і папярэдзіць, што пры паўтарэнні падобных з'явішч у будучым ён паставіць сябе па-за рады партыі. Даручыць загадчыку райана тав. Іофе ўзняць судовую справу аб спагнанні з Красоўскага незаконна атрыманых грошай.

Прапанаваць начальніку планава-фінансавага кіраўніцтва НКА тав. Селаву ў 10-дзенны тэрмін правесці фінансава-гаспадарчую рэвізію 13 і 18 школ і аб рэзультатах паведаміць КПК.

4. Прапанаваць Наркамасветы і адпаведным райана, дзе выяўлены аблічванні настаўнікаў, правесці разлікі з гэтымі настаўнікамі ў дакладнай адпаведнасці з рашэннем ЦК ВКП(б) і СНК СССР.

5. Прапанаваць загадчыку горрайана праверыць правільнасць гарыфікацыі настаўнікаў па школах свайго раёна, а старшыням горрайвыканкомаў аказаць ім адпаведную дапамогу і прасачыць за правільным правядзеннем у жыццё пастановы СНК і ЦК.

Упаўнаважаны КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР ШУС'ІН.

НАЛАДЗІЦЬ РАБОТУ ПА РАЗГЛЯДУ СКАРГАЎ

Камісія Совецкага Кантроля ад 27 кастрычніка 1936 года ў сваёй пастанове аб рэзультатах праверкі работы па скаргах у сістэме Наркамзема Саюза ССР, адзначыла зусім нездавальняючую работу, як у самім наркамаце Саюза, так і ў яго мясцовых зямельных органах.

Як-жа абстаіць справа ў зямельных органах Беларускай ССР?

Загадам наркома земляробства тав. Бенека яшчэ ў 1935 годзе зацвярджан парадак разгляду скаргаў працоўных. Усе паступаючыя скаргі павінны былі разглядацца ў трохдзённы тэрмін. Інспектарская група пры наркоме абавязана наглядаць і інструктаваць работу па скаргах у зональных кіраўніцтвах, аддзелах і сектарах, утвараючы праверку не менш двух разоў у месяц.

Гэта па загаду. У сапраўднасці-ж далёка не так. За 1936 год у Наркамзем БССР паступіла 3848 скаргаў працоўных. Скаргі ахапляюць вялікае кола важных пытанняў. Пішуць аб парушэнні сталінскага статута сельгасарцелі, безгаспадарчасці, раскрадвальніках сацыялістычнай маемасці і аб многім іншым.

Але ў Наркамземе БССР не ўмеюць прыслухоўвацца да скаргаў працоўных. У апараце Наркамзема выяўлена 124 скаргі, на якія за 1936 год не дана ніякага адказу. Многія з гэтых скаргаў маюць ужо поўгадовую і навіт гадовую даўнасць. Ёсць выпадкі, калі скаргі прападаюць бясследна. Вось факты: 28 сакавіка 1936 года паступіла заява ў Наркамзем БССР ад калгасніка Торана з калгаса «Наша ніва», Мозырскага раёна. Ён пісаў аб дрэннай рабоце ў калгасе. 2 красавіка гэта заява зернавым кіраўніцтвам накіравана ў Мозырскі райземаддзел для расследвання. Пасля гэтага паслалі тры напамінкі і ніякага адказу не было. І толькі пасля трэцяга напамінку ад загадчыка райземаддзела тав. Бань атрымана паведамленне, што ніякай скаргі ад калгасніка Торана не паступала. Адным словам, скарга згублена.

Трактарыст Старовіч з Даманавіцкай МТС яшчэ 2 лютага 1936 года прыслаў заяву аб выплаце зарплаты. 7 лютага 1936 г. зернавое кіраўніцтва накіравала гэту скаргу дырэктару МТС з прапановай правесці разлік і паведаміць прычыны затрымкі. Дарэмна сакратар зернавога кіраўніцтва паслаў яшчэ чатыры напамінкі, дырэктар МТС да гэтага часу ўпарта маўчыць.

Калгаснік сельгасарцелі «Луч сонца», Лагойскага раёна, скардзіўся на старшыню праўлення Паўлава, які не выконвае пастановы агульнага схода. 29 кастрычніка скарга накіравана старшыні Лагойскага РВК для расследвання і прыняцця мер. Праз месяц паслалі напамінак, а адказу няма і да гэтага дня.

Не менш абураючую пяганіну прадэманстравала заява члена калгаса «АСО», Асвейскага раёна, т. Плюшчык, які скардзіўся на злоўжыванні ў калгасе. 29 лютага гэта скарга паступіла ў Наркамзем Саюза ССР. 9 красавіка 1936 года яе накіравалі ў Наркамзем БССР. Тут пасля дзесяцідзённай затрымкі яна накіравана ў райземаддзел. Праз шэсць месяцаў была паслана тэлефанаграма з напамінкам у райза, але і яна ніякага дзеяння не выклікала.

23 сакавіка 1936 года 20 калгаснікаў прыслалі скаргу ў НКЗ БССР аб тым, што ў калгасе імя Кірава, Барысаўскага раёна, маюць месца сур'ёзныя злоўжыванні. Гэта скарга, як і ўсе ранейшыя, накіравана ў райземаддзел, але адказу не атрымана. Калгаснікі Расолька Іван, Расолька Захар і калгасніца Крук Агапа калгаса імя Варашылава, Смілавіцкага раёна, яшчэ ў 1935 годзе пры размеркаванні лахода на працадні, замест 4.5 клгр. атрымалі толькі 600 грам на працадзень. Восенню таго-ж года яны паведамілі аб гэтым ў райземаддзел. Райза нічога не прадпрыняў. Вясною 1936 года яны падалі заяву ў Наркамзем БССР. Апрача таго яны зварочваліся да раённага пракурора, але нідзе ім не аказалі дапамогі.

Нельга сказаць, што гэтымі пытаннямі Наркамзем зусім не займаецца. Многа аддае ўвагі пісьмам нарком земляробства БССР тав. Бенек, начальнік ільнаводчага кіраўніцтва т. Савостаў і інш. Але ўся бяда ў тым, што няма ніякай арганізаванасці ў гэтай рабоце. Дасылаюцца скаргі, а за імі напамінкі і ў гэтым заключаецца ўся работа многіх зямельных органаў.

Па прыкладу Наркамзема Саюза ССР неабходна выдзеліць для прыёму скаргнікаў асобнае памяшканне.

Нарком земляробства СССР тав. Чэрноў асабліва настойліва патрабуе, каб для работы па скаргах былі вылучаны кваліфікаваныя і палітычна вытрыманыя работнікі. Большая частка скаргаў павінна вырашацца з выездам на месца.

Мы не можам прывесці ні аднаго выпадку па Беларусі, дзе-б відаць было, што прыехаў работнік наркамата земляробства ў райза і знаходзячы дрэнную работу па скаргах, узяў і асабіста сам арганізаваў гэту справу.

Разам з тым трэба дабіцца, каб кожны райземаддзел час ад часу рабіў справаздачу, як перад раённымі арганізацыямі, так і перад Наркамземам БССР за работу па абслугоўванню скаргнікаў.

Задача заключаецца таксама ў тым, каб арганізаваць работу са скаргамі ў самім цэнтральным апараце Наркамзема БССР, наладзіць гэту работу ў большасці адстаючых райза.

МЯСНІК.
Прадстаўнік НКЗ СССР.

НЯДБАЙНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ЗАХОЎВАННЯ НАСЕННЯ

Першай і важнейшай умовай для павышэння ўраджайнасці з'яўляецца добраякаснае, гатунковае насенне. Ад таго, як калгасы, склады Заготзярно зберагуць гэтае насенне, будзе залежаць і ўраджай. Аднак ужо зараз ёсць факты нядбайных адносін да гатунковага насення.

Дзяржынскі склад «Заготзярно» мае 1000 цэнтнераў гатунковага насення, тут ёсць ячмень «вяцкі» — 140 цэнтнераў, пшаніца «цэзіум» — 160 цнт., пшаніца «люцэстэнс» — 80 цнт. Але яно вельмі дрэнна захоўваецца. Насенне засыпана ў 3 метры вышыні. Гатунковыя дакументы параскіданы, іх можна знайсці на складзе ў канторы. Праверка гатунковасці насення не праведзена, хаця і прымацован да складу спецыяліст насеннакантрольнай станцыі тав. Аколаў.

Злачынна адносіцца да захавання гатунковага насення ў Бярэзінскім раёне. Насенне ў колькасці 600 цэнтнераў аўса і 900 цэнтн. ячменю ў пачатку кастрычніка прыбыла ў Бярэзінскі раён баржай і было згружана на беразе рэчкі. Тут яно праляжала 25 дзён, але на гэтым безгаспадарчасць не спынілася. Частку насення перавезлі ў склад, а частку злажылі пад навесам у мяшках.

Загадчык Бярэзінскага раённага земельнага аддзела тав. Біч і старшы аграном т. Кісель замест таго, каб загадзя паклапаціцца аб захаванні гатунковага насення, зараз, калі яно ўжо сапсавалася, склалі акт і даслалі ў Наркамзем. На гэтым усякія клопаты аб гатунковым насенні ў Бярэзінскім раёне спынены.

Наркамзем выносіў пастановы аб засыпцы, вызначэнні гатунковасці і захаванні насення, пасылаў сваіх інструктароў, а яны даслалі акты, і на гэтым клопаты Наркамзема аб гатунковым насенні спыніліся.

ЕУГ. ЕГОРАВА.

Рамонт праведзен на „выдатна"

Цімкавіцкая машынатрактарная станцыя да рамонту трактароў прыступіла падрыхтавана. Было арганізавана чатыры брыгады, якія заключылі паміж сабою дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшаму і хутчэйшаму рамонту.

Брыгада Чарняўскага спаборнічала з брыгадай Ясючэні, трактарыст Абрамчык Алесь спаборнічаў з Холадам К. Кожны трактарыст меў пэўнае задание па рамонту. Яны дзённую норму выпрацоўкі перавыконвалі ў тры разы. Кожная брыгада за пяцідзённу выпускала з рамонту па 2 трактары. Усяго машынатрактарнай станцыі трэба было адрамантаваць 24 трактары і 26 адзінак сельскагаспадарчага інвентару.

Вялікую дапамогу брыгадам аказваў старшы механік Кульбіцкі. Ён не выпускаў трактара з майстэрні, пакуль сам не праверыць кожную яго дэталь.

Сярод рабочых майстэрні кожны дзень у часе абедзенага перапынку наладжваліся рэгулярныя чыткі газет, трактарысты работу цесна спалучалі з вучобай у тэхнічным гуртку.

За час рамонту зэканомлена 1250 руб. Пры праверцы якасці рамонту тэхнічным інспектарам Наркамзема БССР устаноўлена, што рамонт трактароў і сельскагаспадарчага інвентару выканан на «добра» і «выдатна».

Пры машынатрактарнай станцыі створаны брыгады для дапамогі калгасам у рамонце сельскагаспадарчага інвентару.

За своечасовае і добраякаснае скончанне рамонту дырэктар МТС т. Крыварот і старшы механік тав. Кульбіцкі Наркамземам БССР прэміраваны па 500 руб. кожны. Для прэміравання лепшых стаханаўцаў па рамонту адпушчана 1000 руб.

Я. КОРЗУН.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСА — АРГАНІЗАТАР КРАДЗЯЖОЎ

У калгасе імя Галадзеда, Кузеўскага сельсавета, Лагойскага раёна, знішчаюць конскае паголоўе. На племянной конегадоўчай ферме калгаса за кароткі час абарвала 10 конематак. Прычына абортаў — дрэнны дэтляд і празмерная перагрузка жаробных конематак.

Усе коні на ферме заморены. Кормяць іх толькі сечкаю. Сена, капюшына і мякіна раскрадзены. Арганізатарам усіх пакраж з'яўляюцца старшыня калгаса Алісіёнак і яго намеснік Мардас. Жонка старшыні калгаса была затрымана начным вартаўніком на месцы злачынства пры кражы калгаснай мякіны. Па яе прыкладу некаторыя калгаснікі пачалі раскрадваць салому.

Аб гэтых пакражах ведае старшыня сельсавета Петракоўскі, але ён чамусьці не прымае ніякіх мер і пакрывае злачынцаў.

А. АЛІСІЁНАК.

ПАЗБАЎЦЕ НАС АД ТАКОГА „ВЫХАВАЦЕЛЯ"

Ужо другі год настаўнік Партасевіч здзекуецца над вучнямі андронаўскай школы (Доўсаніцкі сельсавет, Мсціслаўскі раён).

Метады выхавання ў гэтага, з дазволу сказаць, настаўніка даволі своеасаблівыя. Калі вучні на лекцыі няправільна адказваюць на пытанні, Партасевіч абзывае іх самымі грубымі словамі, як асталоп, злодзей і інш. Бываюць выпадкі, калі ён хапае вучняў за каўнер і выкідвае з класа.

Нядаўна да настаўніка прышлі маткі вучняў — член сельсовета Дуня Махлова, Сырыцкая Дар'я, Махлова і інш. Яны ўказалі настаўніку на недапушчальнасць такіх метадаў выхавання. Партасевіч выгнаў іх са школы.

Просім Народны камісарыят асветы пазбавіць нас ад такога «выхавацеля».

Вучні В. МАХЛОЎ, К. ЕЎХІМЕНКА.

Чыгуначнікі Оршы аднадушна адабраюць прыгавор, вынесены пролетарскім судом бандытам — здраднікам нашай радзімы. НА ЗДЫМКУ: мітынг рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і іх сем'яў. З паведамленнем аб прыгаворы пролетарскага суда выступае парторг т. Сергееў.

Фото Я. Салавейчыка.

ВОЛЯ СОВЕЦКАГА НАРОДУ ВЫКАНАНА

ЯШЧЭ ВЫШЭЙ УЗНІМЕМ КЛАСАВУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

(З рэзалюцыі рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых менскай галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе).

Агульнафабрычны сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе, азнаёміўшыся з прыгаворам Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР над ворагамі народу, здраднікамі сацыялістычнай радзімы, над самымі подлымі фашысцкімі гадамі, аднадушна адабрае рашэнне суда.

Мы, рабочыя, выносім сваё пролетарскае дзякуй слаўным чэкістам і генеральнаму камісару дзяржаўнай бяспекі тав. Ежову, якія выкрылі ніці гэтых подлых шпіёнаў, дыверсантаў.

Мы запэўняем ЦК ВКП(б) і нашага любімага бацьку і друга таварыша Сталіна, што яшчэ больш узнімем класавую пільнасць і дапаможам слаўным чэкістам выкрыць усіх ворагаў партыі і народу.

Мы абавязваемся датэрмінова выканаць план 1937 года па ўсіх паказальніках.

Няхай ведаюць ашалелыя сабакі, што мы будзем ахоўваць жыццё нашых правадыроў, як зяніцу вока, бо жыццё вялікага Сталіна і яго саратнікаў даражэй нам за ўласнае жыццё.

ЗА РАДЗІМУ АДДАДЗІМ ЖЫЦЦЁ

Сёння мы даведаліся аб прыгаворы Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР над трацкісцкай бандай. Подлыя гадзюкі атрымалі па заслугах. Так ім і трэба! Чысцей стала паветра на нашай вялікай совецкай зямлі.

Мы, калгаснікі сельскагаспадарчай артэлі імя Варашылава, Віцебскага раёна, шлём сваё гарачае прывітанне ад усяго сэрца і душы нашаму вялікаму бацьку, роднаму Сталіну і гаворым: «Усе нашы калгаснікі беззаветна адданы табе, правадыр, справе партыі Леніна—Сталіна. У любую мінуту мы гатовы аддаць сваё жыццё за нашу любімую радзіму. Яшчэ з большай энергіяй будзем змагацца за 7—8 мільярдаў пудоў хлеба, за ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы».

Калгаснікі: МЕХАЎ, ПАНДЗЖА, ЕФІМАВА.

30 студзеня.

Рабочыя Беларускай чыгункі выкрываюць шкоднікаў

З атрыманнем першага паведамлення па радыё аб вынесеным прыгаворы, ва ўсіх аддзяленнях Беларускай чыгункі былі праведзены сходы і мітынгі.

Лепшы дыспетчар ст. Магілеў т. Зянькоў, выступаючы на сходзе, заявіў:

— Пролетарскі суд вынес правільны прыгавор. Я абавязваюся працаваць яшчэ лепш, чым заўсёды і перавыконваць заданні кіраўніцтва чыгункі па пагрузцы не менш 240 вагонаў у суткі.

Стаханавец-саставіцель тав. Шатаў заявіў:

— Суд вынес прыгавор, які выражае волю 170-мільённага народу Совецкага Саюза. Але не ўсе шкоднікі яшчэ выяўлены. Яны таксама рабілі сваю агідную справу і ў нас на Беларускай чыгунцы, дзе былы начальнік чыгункі Владзімірскі аказаўся трацкісцкім паследышам і падлюгай. Не выпадкова, што нягоднік Владзімірскі пакінуў на зіму кандуктароў і работнікаў кладавых без валёнак. Я гэта кваліфікую, як прамое шкодніцтва, якое мела мэтаю выклікаць незадавальненне.

Агляднік вагонаў станцыі Гомель тав. Жукаў у сваім выступленні ўказаў, што цяпер зразумела, чаму адбылося крушэнне поезда на ст. Гомель. Тут, бясспрэчна, справа рук шкодніка, былога начальніка чыгункі Владзімірскага.

— У адказ на владзействы фашысцкіх агентаў, — гаворыць тав. Жукаў, — стаханаўцы і ўдарнікі Беларускай чыгункі абавязваюцца сістэматычна перавыконваць план пагрузкі і павысіць сваю рэвалюцыйную пільнасць.

У ноч на 30 студзеня, калі совецкі суд вынес свой прыгавор над здраднікамі радзіме, чыгуначнікі пагранічнай Беларускай чыгункі праявілі асаблівую пільнасць. Дзяжурны па ст. Магілеў Грос ноччу заказаў маршрут старшаму стрэлачніку другога паста Міранкову. Міранкоў далажыў Грасу, што путь свабодны. Але Грос, жадаючы лішні раз пераканацца ў правільнасці падрыхтаванага маршрута, звярнуўся да другога старшага стрэлачніка 4-га паста т. Абрамовіча. Аказалася, што путь, на які падрыхтован маршрут, стрэлачнікам Міранковым быў занят вагонамі. Такім чынам, папярэджана крушэнне таварнага поезда. Сход ранішняй змены ст. Магілеў выкрыў Міранкова як браканёра і пасобніка фашыстаў.

Дарожны майстар т. Чэсякоў выявіў лопнуўшы астрак у стрэлцы на ст. Магілеў 2. Дзякуючы пільнасці Чэсякова папярэджана немінучае крушэнне Ленінградскага пасажырскага поезда.

У сувязі з абмеркаваннем прамовы пракурора СССР тав. Вышынскага і прыгавору суда над бандай фашысцкіх наймітаў партарганізацыя чыгункі пры дапамозе лепшых людзей-стаханаўцаў і камандзіраў — усё больш і больш выкрывае факты шкодніцтва ў паравозным гаспадарцы, у пытаннях заработнай платы і эксплаатацыі на чыгунцы, начальнік якой Владзімірскі аказаўся самым гнусным падлюгай, шкоднікам і наймітам шпіёна Ліўшыца.

Чыгуначнікі Беларускай чыгункі ўпэўнены, што выпрабаваны пролетарскі меч — НКУС — здолее да канца разблытаць клубок шкодніцтва Владзімірскага.

ШУЛЬМАН.

Намеснік начальніка палітаддзела Беларускай чыгункі.

НА РАЁННЫХ МІТЫНГАХ У МЕНСКУ

СТАЛІНСКІ РАЁН

Больш 900 рабочых, служачых і кіраўнікоў работнікаў Сталінскага раёна Менска сабраліся 31 студзеня на мітынг у памяшканне Беларускага дзяржаўнага тэатра, каб яшчэ раз выказаць свой гнеў і нянавісць да трацкісцкіх бандытаў, якіх па ўсёй суровасці совецкіх законаў пакараў пролетарскі суд.

У прамовах сакратара райкома партыі тав. Літвіна, які адкрываў мітынг, работніцы фабрыкі «Комунарка» т. Радкевіч, паэта т. А. Александровіча, стаханаўца завода імя Кірава т. Козлыка, настаўніцы Якубсон, заслужанага артыста рэспублікі т. Літвінава, інжынера завода імя Варашылава т. Фрэнкеля было адно — вялікае задавальненне справядлівасцю прыгавору Вярхоўнага суда СССР, які выканаў волю народу, сурова пакараўшы фашысцка-трацкісцкіх сабак. Выступаючыя патрабавалі да канца разблытаць клубок злачынстваў і пасадзіць на лаву падсудных прэвых адшчапенцаў — Бухарына, Рыкава, Угланава і інш., аб чым было і запісана ў аднадушна прынятай рэзалюцыі.

Удзельнікі мітынга паслалі прывітальнае пісьмо любімаму правадыру таварышу Сталіну.

КАГАНОВІЦКІ РАЁН

Зал, усе праходы і фае клуба імя Сталіна запоўнены народам. Рабочыя і служачыя Кагановіцкага раёна прышлі на мітынг, каб яшчэ раз выказаць аднадушнае адабрэнне прыгавору Вярхоўнага суда над трацкісцкай бандай галаварэзаў і прадэманстраваць сваю непахісную волю да стаханаўскай працы, сваю любоў да вялікага Сталіна.

Сакратар Кагановіцкага райкома партыі тав. Варончанка ў сваёй змястоўнай прамове даў характарыстыку злачыннай дзейнасці здраднікаў радзімы, прадажных агентаў фашызма Пятакова, Радэка, Сакольнікава, Серэбракова і інш. забойц. Вялікую частку сваёй прамовы ён прысвяціў урокам гэтага працэса, неабходнасці павышэння рэвалюцыйнай пільнасці на кожным участку работы.

Слова папрасіла ордэнаноска фабрыкі «Кастрычнік» т. Кісель.

Прыгавор суда, — сказала яна, — гэта — прыгавор усяго народу, які моцнай сцяной акружае нашых правадыроў. Будзем мацаваць абарону, будзем паляпшаць стаханаўскую работу. Гэта — лепшы адказ на прошукі ворагаў.

З гарачымі і ўсхваляванымі прамовамі выступалі таксама т.т. Скабло, Капчэй (чыгунка), прафесары Голуб і Ермоленка, Баскін (фабрыка імя Кагановіча), Сымон (фабрыка імя Куйбышэва) і інш. Усе яны аднадушна адабралі прыгавор суда, выказвалі сваю бязмежную любоў і адданасць партыі і вялікаму правадыру таварышу Сталіну, канкрэтнымі справамі абавязаліся адказаць на прошукі ворагаў.

Пад гром працяжных воплескаў быў прынят тэкст прывітальнай тэлеграмы таварышу Сталіну.

ВОДГУКІ ЗА МЯЖОЙ НА ПРЫГАВОР ВЯРХОЎНАГА СУДА

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 31 студзеня. (БЕЛТА). У цэнтры ўвагі ўсёй чэхаславацкай грамадскасці стаіць сёння прыгавор па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра. Мэжна без перабольшвання сказаць, што самы працэс і ў асаблівасці прыгавор зрабілі вялікае ўражанне на ўсе слаі чэхаславацкай грамадскасці. Працэс трацкістаў з'яўляецца адной з асноўных тэм размоў, абмеркаванняў і дыскусій у палітычных, культурных і ў першую чаргу рабочых колах Прагі.

Палітычны штотыднёвік чэхаславацкіх соцыял-дэмакратаў «Нова свабода» змяшчае артыкул аб працэсе трацкістаў, у якім піша: «Троцкі спекулюе на вайне, бо ён разглядае новую сусветную вайну, як адзіны шлях да сваёй перамогі. Тут Троцкі і яго прыяцелі апынуліся ў сувязі з міжнародным фашызмам, з яго захватніцкімі планамі, бо ўсякая вайна неміну-ча будзе прадстаўляць узброеную сутычку паміж дэмакратыяй і прагрэсіўным чалавецтвам з аднаго боку, і фашызмам і сярэдневяковым мракабесцем — з другога».

ЗША

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 30 студзеня. (БЕЛТА). Орган компартыі газета «Дэйлі уоркер» выпусціла спецыяльны нумар, прысвечаны працэсу антысовецкага трацкісцкага цэнтра. Газета публікуе на чатырох старонках паказанні падсудных і змест прамовы дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Вышынскага.

Змешчан таксама артыкул генеральнага сакратара компартыі ЗША Броудэра, які піша, што «ні адзін чэсны чалавек, зацікаўлены ў захаванні міру і ў прагрэсе, не можа займаць нейтральную пазіцыю ў адносінах да трацкістаў, якія выдуць фашысцкую падрыўную дзейнасць у радах рабочага класа». Далей Броудэр указвае, што працэс антысовецкага трацкісцкага цэнтра саслужыць велізарную службу рабочым ЗША і ўсяго свету ў справе выкрыцця сапраўднага характару трацкізма. Броудэр заклікае рабочых і ўсе прагрэсіўныя элементы ізаляваць і выгнаць трацкістаў з радоў рабочага руху.

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 31 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляе орган компартыі «Юманітэ», парламенцкая фракцыя французскай компартыі аднадушна выразіла сваё абурэнне па поваду злачынстваў, зробленых здраднікамі, прадстаўшымі перад Вярхоўным судом Совецкага Саюза.

Парламенцкая фракцыя компартыі ганьбіць гнусныя прошукі трацкістаў, купленых Гітлерам і імперыялістычнай Японіяй. Фракцыя вітае пролетарыят Совецкага Саюза, яго компартыю і яго правадыроў, якія ажыццяўляюць сацыялізм наперакор шкоднічству ворагаў справы міру.

АЎСТРЫЯ

ВЕНА (сталіца Аўстрыі), 31 студзеня. (БЕЛТА). Аўстрыйскія газеты друкуюць паведамленне аб прыгаворы па справе антысовецкага трацкісцкага цэнтра. Нават некаторыя антысовецка настроеныя газеты вымушаны прызнаць пераканаўчасць і абгрунтаванасць абвінавачанняў, прад'яўленых падсудным.

ТАМ, ДЗЕ СТРАЦІЛІ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

У 1935 годзе з Растова-на-Дану ў Гомель прыехаў прафесар Н. І. Ефімаў, стары знаёмы загадчыка навучальнай часткі гомельскага педагагічнага інстытута прафесара Бяляева. Дырэктар пэдінстытута тав. Сташэўскі з распасцёртымі абдымкамі сустрэў новапрыбыўшага прафесара і неадкладна назначыў яго дэканам літаратурнага факультэта.

З гэтага моманту прафесар Ефімаў стаў нераздэльна «ўладарнічаць» на літфаку, асабіста выкладаючы рускую літаратуру. Ён нікога не пускаў на свае лекцыі, нават дырэктара інстытута і сакратара парткома. Ахоўваючы тайны сваёй дзейнасці, Ефімаў два гады гаспадарыў на літфаку гомельскага пэдінстытута.

Па рэкамендацыі Ефімава студэнты карысталіся падручнікам па тэорыі літаратуры, які напісан калчакаўцам-трацкістам Русанавым. У гэтым, з дазволу сказаць, падручніку Русанаў усхваляе агента Гестапо Іудушку-Троцкага.

Гэта белагвардзейская страшня, прывезеная адкульсці Ефімавым, доўга служыла прадметам «выхавання» совецкіх студэнтаў.

Па катэгарычнаму патрабаванню Ефімава інстытуцкая бібліятэка папоўнілася і іншай трацкісцкай літаратурай. На стойках рэкамендуемай літаратуры з'явіліся кнігі, напісаныя трацкістамі Лелевічам, Фрыдляндам і нават агентам германскага фашызма Л. Каменевым. Карыстаючыся тэтымі кнігамі, студэнты на свой страх выкрэслілі найбольш контрэволюцыйныя, выклікаючыя ў совецкага грамадзяніна агіднасць, словы.

Дырэктар інстытута тав. Сташэўскі не толькі ведаў аб гэтым, але і аплачваў рахункі на купленую контрэволюцыйную літаратуру. Аб тым, што ў інстытут пападае падазроная літаратура ведаў і часова выконваючы абавязкі загадчыка культпрапаганды гаркома КП(б)Б тав. Музыкін, але ён чамусьці не палічыў патрэбным умяшацца ў інстытуцкія справы.

Рэдакцыя гомельскай газеты «Палеская праўда», лічачы Ефімава бясспрэчным аўтарытэтам у літаратурных справах, паслужыла прадастаўляла свае старонкі для артыкула Ефімава «А. С. Пушкін», не патурбаваўшыся разабрацца ў прафесарскіх думках і вывадах аб вялікім рускім паэце. А Ефімаў і тут не прамінуў зрабіць сваю брудную справу. Ён праз совецкі друк, карыстаючыся прытуленнем пільнасці рэдактара, уводзіць яўны паклёп на вялікага рускага паэта, выстаўляючы А. С. Пушкіна як еўрапейца, паэта Захада, а не Расіі.

Аднойчы на мітынгу, прысвечаным падзеям у Іспаніі, выступіла студэнтка першага курса літфака тав. Тураўская, якая як умела, выказала сваё абурэнне супроць фашысцкіх бандытаў. Гэта шчырае выступленне Тураўскай не спадабалася «пану» прафесару. На другі дзень перад тым як пачаць лекцыю Ефімаў вызваў Тураўскую да класнай дошкі і перад усім курсам заявіў «віноўнай».

— Я на вашым месцы пасля такога выступлення скінуўся-б з чапвертага паверху.

Ефімаў сваю «назідальную» прамову скончыў істэрычным крыкам:

— Калі не ўмееце выступаць, дык не выступайце, запомніце гэта і сядзьце.

Ефімаў стварыў вакол сябе групу студэнтаў, якія пад яго кіраўніцтвам рабілі «лоўду» на літфаку.

Вось напоўны пералік «дзеянняў» прафесара Ефімава ў гомельскім пэдінстытуце.

Паўстае пытанне: як магло здарыцца, што чорнасоценец, прыкрыўшыся прафесарскім мундзірам, змог беспакарана арудваць у совецкай вышэйшай педагагічнай установе? Для таго, каб гэта зразумець, трэба глыбей прыглядзецца да становішча гомельскага пэдінстытута.

Перш за ўсё трэба ўказаць на кругавую паруку, сямейнасць, якая існавала сярод кіруючых работнікаў інстытута. Прафесар Бяляеў, будучы загадчыкам навучальнай часткі пэдінстытута, пакрываў варожыя ўчынкі Ефімава. Апошні не застаўся ў даўгу перад Бяляевым. Ефімаў напісаў дакладную запіску ў Цэнтральны вучоны совет СССР аб прысваенні Бяляеву доктарскай годнасці. Гэта запіска павінна была абмяркоўвацца на совеце інстытута, аднак гэтага не было зроблена, хоць гэта запіска і накіравана ў Маскву як заключэнне совета інстытута. Блізарукі дырэктар інстытута Сташэўскі, ведаючы ўсё гэта, падпісаў запіску.

Якія-ж «працы» мае Бяляеў для таго, каб быць заслужаным доктарскай годнасці? Аказваецца, што Бяляеў калісьці напісаў «кнігі нябесныя» і «Апокрыф» і іншыя рэчы, якія адносяцца да спраў «бажэственых», якіясьці падазроныя «працы», і бадай ці варта за іх даваць доктарскую годнасць.

Прафесар Бяляеў чамусьці схільны да «свяшчэннага пісання». Мабыць таму ў гомельскім пэдінстытуце ў якасці адзінага з падручнікаў служыць евангеліе. Выкладчык мовы Масайлаў для вывучэння старажытнай мовы не знайшоў іншай кнігі апрача евангеліе. І вось студэнты пад дыктоўку Масайлава спісваюць ў сваё сшыткі і вывучаюць біяграфію «Ісуса Хрыста».

На гэтай глебе ў студэнткі Вішняковай выпаў канфуз. Вішнякова ў часе канікул прыехала да сябе ў калгас: маці студэнткі, калгасніца, убачыўшы «бажэственыя» запісы ў сшытках, стала лаяць дачку за вучэнне «закона божага».

Прычынай, якая спрыяла разлагальнай рабоце такіх людзішак, як Ефімаў, з'яўляецца таксама і засмечанасць выкладчыцкіх кадраў інстытута варожым элементам. Выкладчык Масайлаў заявіў: — Я — вучань Ігнатоўскага.

У гомельскім пэдінстытуце была выключна спрыяльная абстаноўка для дзейнасці варожых нашай справе людзей. Тут дастаткова было назвацца прафесарам, як гэты чалавек неадкладна залічваўся ў склад выкладчыкаў інстытута. Нежаторы час у інстытуце выкладаў Юшкевіч, якога тут таксама лічылі прафесарам. Аднак гэты Юшкевіч не мае нічога агульнага са званнем прафесара.

У інстытуце 43 выкладчыкі. З гэтай колькасці на 17 чалавек зусім няма ніякіх дакументаў, якія-б характарызавалі гэтых выкладчыкаў.

Прыведзеныя факты гавораць аб тым, што ў гомельскім пэдінстытуце ў выніку страты большэвіцкай пільнасці з боку кіраўніцтва і партарганізацыі, класава-варожыя элементы рабілі сваю контрэволюцыйную справу. У гэты-ж час і дырэктар інстытута тав. Сташэўскі і сакратар парткома тав. Масюкова не адзін раз балбаталі аб пільнасці.

Гомельскі гарком КП(б)Б праглядзеў становішча ў пэдінстытуце і тым самым даў магчымасць бяспакарана дзейнічаць ворагам народу.

П. ЧЫКУН.

ВОРАГІ НАРОДУ АРУДУЮЦЬ НА ТОРФЗАВОДЗЕ „СВАБОДА"

АСІПАВІЧЫ. (Ад спец. кар. «Звязды»). Торфазавод «Свабода» ў 1936 годзе выканаў план торфаздабычы толькі на 92 проц., а план вывазкі — на 64 проц.

Асноўная прычына ганебнай работы завода — гэта ігнараванне стаханаўскага руху, чыноўніцкія і бяздушныя адносіны да людзей.

— Колькі ў вас стаханаўцаў? — запыталі мы ў дырэктара завода Шкляра.

— Іх у нас 50 чалавек, — адказаў Шкляр.

Больш нічога не мог ён да гэтага дадаць. Аб рабоце асобных стаханаўцаў Шкляру нічога невядома. Ён нават не ведаў, што некаторыя з названых ім стаханаўцаў даўно на заводзе не працуюць (Галарэзік і інш). А ў разгортванні стаханаўскага руху перашкаджае рад, з першага погляду, дробных непаладкаў.

...На адлегласці двух кілометраў ад завода размешчаны на балоце штабялі торфу. Ноч. Цёмна. Толькі ледзь-ледзь цмяна бліпчаць два сапсаваныя ліхтары. Тут працуе звяно стаханаўкі Мані Лозбінай па пагрузцы торфу ў аўтамашыны.

— Ліхтары нашы, — скардзіцца нам т. Лозбіна, — нікуды не варты. Яны зусім сапсаваны і сістэматычна тухнуць. Працуем упоцемках, не відаць куды кідаць тарфяную цэглу. Апрача таго, штабялі торфу ўмерзлі. Перш чым пачаць пагрузку, нам трэба ламаць штабель ломам. На гэта ідзе шмат часу, і аўтатранспарт прастойвае. У результаце план пагрузкі выконваецца не больш чым на 50 проц.

Аналагічнае становішча і на тралёўцы торфу. І тут работа зрываецца з-за адсутнасці святла.

Што робіць адміністрацыя, каб асвятліць месца пагрузкі і гэтым самым стварыць умовы для павышэння прадукцыйнасці працы? Нічога! Ужо даўно Шкляр абяцае паставіць дынамамашыну на балоце і правесці электрычнае асвятленне. Але далей абяцанняў на заводзе не ідуць.

Адбіваюцца на прадукцыйнасці працы і кватэрныя ўмовы рабочых. Інтэрнаты, дзе жывуць рабочыя, у большасці халодныя, няўтульныя. Масава-выхаваўчая работа сярод рабочых не праводзіцца. Ленкуток і клуб заўсёды на замку. Нядзіва, што ў інтэрнатах часта адбываюцца п'янкі, картачныя гульні.

Застаецца яшчэ дадаць, што падрыхтоўка да сезону 1937 года, які пачнецца, прыблізна, з 15 красавіка, ідзе яўна нездавальняюча. Вярбоўка рабочай сілы зрываецца. З патрэбных 1135 чалавек, завербавана... 117. Падрыхтоўка інтэрнатаў амаль не распачата.

Такое агіднае становішча на заводзе становіцца зразумелым, калі мы бліжэй азнаёмімся з тварам кіраўніцтва завода.

Хто стаіць на чале кіраўніцтва завода?

Шкляр — былы меншавік. У 1923 годзе ён, будучы студэнтам гомельскай губсоўпартшколы, актыўна абараняў кэнтрэволюцыйную платформу Л. Троцкага.

Намеснікам дырэктара — загалчыкам гаспадаркі завода працуе запрошаны Шкляром заядлы трацкіст Басін.

З рабочымі Шкляр і Басін абыходзяцца бяздушна.

Аднаго разу летам 1936 года Шкляр з'явіўся на балота, каб азнаёміцца з ходам работы. Сезонны рабочы Міхалап з Кіраўскага раёна ў гэты час якраз стаяў ля кар'ера і курыў. Шкляр, нічога не гаворачы, кінуўся на Міхалапа і збіў яго. Потым дзяржыморда Шкляр дае загад каменданту Зунікаву, каб той забраў усе яго пасцельныя прылады і не пусціў начаваць у інтэрнат. Міхалап быў вымушан пакінуць завод.

Або такі выпадак. Днямі рабочы, дэмабілізаваны ўчастковы міліцыянер т. Шумейка Шклярам быў знят з працы кладаўшчыка толькі за тое, што ён у выходны дзень, папярэдзіўшы загадчыка гаспадаркі, пайшоў па сваіх асабістых справах на некалькі гадзін на станцыю...

Такіх прыкладаў можна прывесці многа.

Заядлыя трацкісты Шкляр і Басін здзекваюцца над рабочымі, зрываюць выкананне плана, ігнаруюць і сабатуюць стаханаўскі рух на заводзе. Усё гэта праходзіць беспакарана толькі таму, што ў Белдзяржторфе сядзяць добрадушныя лібералы Кузняцоў і Сакольчык, якія, як відаць, не здольны палажыць канец падрыўной рабоце трацкістаў на заводзе.

Здзіўляе пазіцыя «неўмяшання», занятая ў адносінах да трацкістаў на заводзе, Асіпавіцкім райкомам КП(б)Б.

В. АСТРОЎСКІ.

ПАХАВАННЕ М. Л. ПАЛУНОВА

З самай раніцы і да паловы трэцяй гадзіны дня 31 студзеня ў Дом Чырвонай Арміі, дзе пакоілася цела камандзіра-камісара 2-й Беларускай дывізіі Мірона Львовіча Палунова, бесперапынным патокам ішлі байцы і камандзіры чырвонаармейскіх часцей і працоўныя сталіцы. Ішлі аддаць апошні доўг большэвіку-камандзіру, даць клятву высока трымаць баявы сцяг дывізіі і быць заўсёды напагатове.

Пастамент, на якім стаяла труна, паступова абрастаў шматлікімі вянкамі. А калове трэцяй гадзіны дня доступ да труны быў спынен, была знята апошняя гарадовая варта. Ля пакойнага засталася яго маці і старэйшы брат. У залу зайшлі і выстраіліся ў нерухомым карэ камандзіры і палітработнікі. Пачалася грамадзянская паніхіда.

— Смерць вырвала з нашых радоў аднаго з лепшых таварышоў, слаўнага камандзіра Мірона Львовіча, — гаворыць дывізійны камісар Бальчэнка. — Мы ўвекавечым яго памяць тым, што штодзенна будзем умацоўваць баявую магутнасць нашай Чырвонай Арміі.

Ад байцоў, камандзіраў і палітработнікаў 2-й Беларускай дывізіі палкоўнік Саракоп дае клятву з яшчэ большай сілай і энергіяй валодаць баявой тэхнікай, каб заўсёды быць гатовымі даць сакрушальны адпор ворагу.

Апошнім гаворыць камандуючы БВА камандарм першага ранга тав. Убарэвіч. Камандарм гаворыць аб тым, што Мірон Львовіч быў сапраўдным камандзірам нашай Чырвонай Арміі, у якую ён уступіў яшчэ будучы юнаком. У жыцці Мірон Львовіч быў простым, разумеў сілу дружбы і таварыства. Ён прайшоў шматлікія франты грамадзянскай вайны, на якіх быў увесь эранен. Ён верыў у сілу Чырвонай Арміі, верыў у нашу вялікую барацьбу супроць ворагаў усяго працоўнага і прагрэсіўнага чалавецтва; ён гарэў гэтай барацьбой. Ён быў адданейшым сынам нашай партыі, нашай радзімы.

Гукі жалобнага марша запаўняюць гэты будынак. Труну з целам Мірона Львовіча выносяць на руках тав. Убарэвіч, начальнік палітычнага кіраўніцтва БВА армейскі камісар другога ранга тав. Булін, камандзіры і камісары чырвонаармейскіх часцей і ўстанаўліваюць яе на лафет гарматы. Пахавальны працэс рушыць на могілкі. Наперадзе на аксамітных падушачках камандзіры нясуць ордэны Мірона Львовіча, дзесяткі вянкоў. І як скінуць вокам, ідуць калоны байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі і працоўныя.

Пад трохразовы ружэйны і гарматны залп труна камандзіра апускаецца ў магілу. У гэтых дружных залпах адчуваецца сіла і магутнасць нашай слаўнай Чырвонай Арміі. У гэты дзень працоўныя яшчэ раз паказалі вялікую любоў да сваёй роднай арміі, якая заўсёды пільна ахоўвае заваёвы Кастрычніка.

Водны басейн менскага Дома Чырвонай Арміі імя Варашылава карыстаецца вялікай любоўю не толькі сярод камандзіраў і чырвонаармейцаў, але і сярод рабочай моладзі і школьнікаў горада.
У выходныя дні школьнікі пад кіраўніцтвам вопытных інструктароў воднага спорту вучацца плаваць у басейне Дома Чырвонай Арміі. НА ЗДЫМКУ (злева направа): вучаніца 8-га класа 9-й школы Ф. Карурым і вучаніца 6-га класа 5-й школы М. Самсонава выходзяць з басейна пасля плавання.
Фото С. Грына і В. Лейна (БСФ).

КАВАЛЕРЫСТЫ

Узрываючы капытамі снег, добра ўшітаная цёмна-рыжая кабыліца па кліцы «Бітва» галопам нясе ліхога наезніка-калгасніка з калгаса імя Чапаева, Мсціслаўскага раёна, Феафана Сокала. У яго руцэ на праменнях студзеньскага сонца сталлю паблісквае клінок. Раз, два, тры, чатыры... — і кожны раз з-пад клінка ляціць ссечаная лаза. Вось клінок пракалоў гліняны шар і зняў колца. На працягу літаральна некалькіх секунд усе шэсць цэлей паражаны.

За ім у такім-жа віхры галопу, стоячы на сядле, праносіцца калгаснік Ілья Беразоўскі з калгаса «Чырвоная ніва», Церахоўскага раёна. Ён яшчэ з большым майстэрствам паражае ўсе цэлі і заваёўвае першае месца па рубцы ў сённешніх конна-спартыўных спаборніцтвах курсантаў школы, прысвечаных 10-годдзю Асоавіяхіма.

У Беларускую школу кавалерыстаў яны прышлі з розных калгасаў Совецкай Беларусі.

Сярод іх можна сустрэць і бязвусых комсамольцаў і былых будзёнаўцаў, якія ўжо не адзін раз секлі не лазу, а галовы сапраўдных ворагаў, пасягаўшых на святасць зямлі совецкай, на шчасце працоўных. Вось толькі-што праіжчаўся на кані калгаснік Сокал. У гады грамадзянскай вайны, будучы 20-галовым юнаком, ён таксама адважна хадзіў у атакі пад кіраўніцтвам маршала Совецкага Саюза С. М. Будзённага на белапольскіх акупантаў.

— У школе я памаладзеў год на дзесяць, — жартуючы гаворыць Феафан. — Я вельмі люблю коней, а яшчэ больш — конны спорт. Вось ужо больш дзесяці год, як я ў калгасе працую загадчыкам конетаварнай фермы. Па скончэнні школы кавалерыстаў ва-ўсю завярну справу арганізацыі ў калгасах свайго раёна гурткоў варашылаўскіх коннікаў.

Школа кавалерыстаў яшчэ вельмі маладая, яна арганізавалася ў чэрвені мінулага года. Задача яе — рыхтаваць загадчыкаў калгасных конетаварных ферм і высокакваліфікаваных кавалёў па коўцы коней. Адначасова кожнаму скончыўшаму школу прысвойваецца званне інструктара і малодшага інструктара Асоавіяхіма па конна-спартыўнай справе. Першы выпуск у школе адбыўся восенню мінулага года. Зараз навучаецца другі набор курсантаў, які будзе выпушчан у сакавіку—маі г. г.

Працуючы ў калгасах, былыя курсанты не парываюць сувязі з школай. Яны прысылаюць пісьмы, у якіх дзеляцца сваімі поспехамі па арганізацыі гурткоў, узводаў, эскадронаў варашылаўскіх коннікаў, пытаюцца парад.

Кавалерыйская школа стала цэнтрам у рэспубліцы па падрыхтоўцы варашылаўскіх коннікаў. Школа атрымлівае дзесяткі пісем не толькі ад сваіх былых курсантаў, але і ад астатніх кіраўнікоў гурткамі варашылаўскіх коннікаў, якім даюцца адказы на іх запытанні. У часе конна-спартыўнага прабегу па 112 калгасах нашай рэспублікі камандаванне і курсанты школы на месцы давалі парады кіраўнікам гурткоў і арганізавалі 19 новых гурткоў варашылаўскіх коннікаў.

Школа зараз рыхтуецца, каб у дзень XVII гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў выступіць на парадзе ў сталіцы цэлай дывізіяй калгасных варашылаўскіх коннікаў.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

Творы Пушкіна чытаюць на роднай мове

РЭЧЫЦА. (Спец. кар. «Звязды»). Ва ўсіх кутках нашай краіны працоўныя розных нацыянальнасцей з любоўю чытаюць і вывучаюць на сваіх родных мовах творы геніяльнага рускага паэта А. С. Пушкіна. У рэчыцкай раённай бібліятэцы ёсць 600 экз. твораў Пушкіна на рускай, беларускай, яўрэйскай, польскай, нямецкай і цыганскай мовах. З тоох тысяч сталых чытачоў бібліятэкі ўсе прачыталі творы паэта. Цікавыя мерапрыемствы праводзіць бібліятэка ў сувязі з падрыхтоўкай да стагоддзя з дня смерці паэта. Бібліятэка збірае водгукі чытачоў аб кнігах Пушкіна.

Пры бібліятэцы арганізован спецыяльны дзіцячы гурток для малявання ілюстрацый да твораў Пушкіна. Вучань 5 класа школы імя Караленка Зуся Отман даў свой малюнак «Пушкін у сяле Міхайлаўскім». Ён-жа зрабіў ілюстрацыю к «Сказке о попе и его работнике балде». Бібліятэка рыхтуе выстаўку аб жыцці і творчасці паэта.

ГАСМАН.

ЭКСКУРСІІ І ПАДАРОЖЖЫ

Беларускае бюро падарожжаў пры турысцка - экскурсійным кіраўніцтве ВЦСПС арганізуе ў гэтым годзе экскурсіі і турысцкія падарожжы для 6.500 чалавек. Апрача мінулагодніх маршрутаў па Крыму, Каўказу, Заходняй Сібіры і Алтаю, у 1937 г. упершыню адкрываецца рад новых маршрутаў.

Да 100-годдзя з дня смерці вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна адкрываецца спецыяльны «пушкінскі маршрут», разлічаны на 5 дзён. Экскурсанты азнаёмяцца з прабываннем Пушкіна ў Дзепкім Сяле, затым аўтобусам зробяць паездку па Ленінграду, у часе якой ім пакажуць «Пушкінскі Пецербург», яны наведаюць музей-кватэру паэта на Мойцы і месца дуэлі — Чорную рэчку. Экскурсанты пабудуць у Петрапаўлаўскай крэпасці, дзе азнаёмяцца з паўстаннем дзекабрыстаў і нікалаеўскай рэакцыяй, агледзяць «Эрмітаж», музей Рэвалюцыі і палац імя Урыцкага. У заключэнні яны прагледзяць адзін з пушкінскіх спектакляў у адным з ленінградскіх дзяржаўных тэатраў.

На Паўночным Каўказе ў курортнай мясцовасці Теберда адкрыўся з 1 студзеня горна-лыжны дом турыстаў. Гэта падарожжа разлічана на 10 дзён. Турысты будуць рабіць лыжныя вылазкі, усходжанні на горныя вяршыні. Недалёка ад Теберды на Дамбайскай Паляне адкрылася горна-лыжная школа. Экскурсанты правядуць там 15 дзён і пройдуць курс горна - лыжнай тэхнікі пад кіраўніцтвам чэмпіёна Густава Дэберля.

Новымі маршрутамі таксама з'яўляюцца Ленінград — Мурманск — Кіраўск і падарожжа ў Горкі. Там турысты азнаёмяцца з гістарычнымі старажытнасцямі Ніжняга - Ноўгарада і новым сопыялістычным горадам СССР — Горкім.

І. ЦЫВЕС.

ДАСТОЙНЫ ПАСТУПАК

Раённая газета «За калектывізацыю» (Нароўля) паведамляе аб дастойным паступку грамадзяніна Рыгора Машкоўскага і яго жонкі. У 3 гадзіны ночы 15 студзеня Машкоўскія варталіся дамоў. У доме № 5 па Кастрычніцкай вуліцы, дзе знаходзіцца водная тэлефонная станцыя, яны заўважылі на даху святло. Там штосьці гарэла. Вельмі хутка было прынята рашэнне. Не палымаючы панікі, Машкоўскія залезлі на дах і пачалі тушыць загараўшуюся балку. На дапамогу ім надышлі суседзі і пажар, які мог прычыніць вялікія страты, быў ліквідаваны.

РЭКОРДЫ ПА КАНЬКАХ

Гарадскія спаборніцтвы па канках скончыліся ў Менску перамогай каманды «Дынама». Другое месца занялі канькабежцы тэхнікума фізкультуры. Званне чэмпіёнаў горада 1937 года заваявалі Барыс і Зоя Бальшаковы (Дынама). Сярод юнакоў званне чэмпіёнаў заваявалі Лашэўскі і Смілевіч.

Чэмпіён рэспублікі Барыс Бальшакоў, не гледзячы на моцны холад, устанавіў новы рэкорд БССР на дыстанцыю 1.500 метраў — 2 мін. 35,8 сек. Ранейшы яго рэкорд быў 2 мін. 38,7 сек. Зоя Бальшакова палепшыла на 7,6 сек. леташні рэкорд Рудаковай на 1.000 метраў. Яе рэзультат — 1 мін. 58,5 сек.

ЗАКЛАДКА ПОМНІКА ГЕРОЯМ-СТРАТАНАЎТАМ

МАСКВА, 31 студзеня. (БЕЛТА). Тры гады назад — 30 студзеня 1934 года — пацярпеў аварыю стратастат «Осоавиахим». Загінулі адважныя даследчыкі заваблачных вышынь — таварышы П. Ф. Федасеенка, А. Б. Васенка і І. Д. Усыскін.

30 студзеня на тэрыторыі Цэнтральнага аэраклуба імя А. В. Косарэва была зроблена закладка помніка героям стратасферы.

На мітынгу, прысвечаным памяці стратанаўтаў, прысутнічалі віруючыя работнікі ЦС Асоавіяхіма, радня адважных даследчыкаў і лётна-тэхнічны склад Цэнтральнага аэраклуба.

На месцы, дзе будзе помнік, устаноўлен гранітны камень, у які ўпраўлена мраморная дошка з надпісам:

«Слаўным героям-даследчыкам стратасферы т. Федасеенка П. Ф., т. Васенка А. Б., т. Усыскіну І. Д., загінуўшым 30 студзеня 1934 г. пры аварыі стратастата «Осоавиахим».

5 ГОД МАГНІТАГОРСКАГА КАМБІНАТА

МАГНІТАГОРСК, 31 студзеня. (БЕЛТА). Працоўныя Магнітагорска радасна адзначылі пяцігоддзе існавання гіганта соцыялістычнай індустрыі—металургічнага камбіната імя Сталіна. На свята прыехала шмат гасцей: прадстаўнікі абласных арганізацый, дэлегацыі кузнецкага металургічнага завода, чэлябінскага трактарнага завода, прадстаўнікі шадзэфных вайсковых часцей і інш.

30 студзеня ў драматычным тэатры адбыўся агульнагарадскі ўрачысты сход рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых камбіната разам з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый.

З дакладам аб рабоце камбіната за 5 год выступіў начальнік камбіната ордэнаносец тав. Завенягін.

З прамовай выступіў сакратар чэлябінскага абкома партыі тав. Рынзін.

Калектыў камбіната атрымаў шмат прывітанняў з розных канцоў краіны. Атрымана прывітанне ад наркома цяжкай прамысловасці тав. Орджанікідзе.

У сувязі з 5-годдзем камбіната тав. Завенягін прэміраваў каштоўнымі падарункамі лепшых стахаланўцаў.

ПА КРАІНЕ СОВЕТАЎ

◎ 1 лютага на ўсёй тэрыторыі Саюза, апрача раённых крайніх Поўначы, пачаўся ўсесаюзны перапіс жывёлы. Асноўная мета перапісу — праверыць выкананне дзяржаўнага плана развіцця жывёлагадоўлі ў 1936 годзе. Перапіс жывёлы разлічан на 8—10 дзён. У ім прымуць удзел звыш 100.000 рэгістратараў.

* * *

◎ 30 студзеня Чэлябінскі трактарны завод упершыню выпусціў 131 трактар, замест 108 па плану.

* * *

◎ Акадэмія навук СССР аб'явіла адкрыты конкурс на праект помніка Д. І. Мендэлееву ў Ленінградзе. У склад камісіі па правядзенню конкурса ўвайшлі: прэзідэнт Акадэміі навук СССР акадэмік В. Л. Камароў (старшыня камісіі), удава Д. І. Мендэлеева — А. І. Мендэлеева, рад акадэмікаў і прафесароў.

ШТО НОВАГА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ БССР

ІГОЛКІ

Вытворчасць іголак на віцебскай іголкавай фабрыцы ў гэтым годзе значна павялічваецца, паляпшаецца іх якасць. У мінулым годзе патэфонных іголак фабрыка выпусціла 160 мільёнаў штук. У гэтым годзе іх будзе выпушчана 350 мільёнаў. Для паляпшэння якасці патэфонных іголак зменен тэхналагічны працэс. Іголкі зараз пакуюцца ў бляшаных каробачках.

Значна павялічваецца вытворчасць ручных і швейных іголак. Супроць мінулагодніх 196 мільёнаў у гэтым годзе будзе выпушчана 300 мільёнаў штук. Для выгод спажыўца павялічваецца выпуск спецыяльных набораў розных іголак па 10, 20 штук у адной пачцы, так званых «асарці».

Па тэхнічных іголках — фабрыка ладаткова асвайвае іголкі для ільночасальных машын, якія да гэтага часу імпартаваліся. У чацвертым квартале 1937 года ўступіць у строй з самым дасканалым абсталяваннем новы корпус фабрыкі.

РАСКРАДАЛЬНІКІ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЕМАСЦІ

Віцебскім аддзяленнем крымінальнага вышуку затрыманы памочнік начальніка трыкатажнага цэха гомельскай фабрыкі імя 8 сакавіка Міончынскі і яго жонка Міончынская Еўгенія, а таксама група механікаў віцебскай фабрыкі «КІМ» — Смолікаў, Вінакураў, Вінаградаў, Іваноў, кладаўшчык Каржановіч. Усе яны доўгі час займаліся раскрадваннем іголак на фабрыцы «КІМ». Крадзеныя іголкі прадаваліся гомельскай фабрыцы імя 8 сакавіка Міончынскім як законна купленыя. Жонка Міончынскага дапамагала мужу рабіць фіктыўныя рахункі. Пры вобыску ў Міончынскага знойдзена 8 тыс. іголак на суму 5 тыс. рублёў, украдзеныя з фабрыкі «КІМ».

А. З.

КОРАТКА

* Новыя паштовыя аўтобусныя лініі Менск—Уэда і Гомель—Лоеў адкрыў Упоўнаркамсувязі БССР у студзені месяцы. Гэта дало магчымасць працоўным Лоева атрымліваць газеты і карэспандэнцыю на два дні раней звычайнага, працоўным Уэды—на адзін дзень.

* Пяць піянін завезена на атаварванне хлебазакупак у раёны БССР. Першым купіў піяніна для калгаснага дома соцкультуры калгас «Ленінскі шлях». Самахвалавіцкага сельсовета, Менскага раёна. У студзені ў раёны БССР будзе завезена яшчэ 10 піянін.

* Узоры дом соцкультуры пабудаваў у вёсцы Аазраны, Рагачоўскага раёна. Пры доме ёсць вялікая бібліятэка. Тры разы ў месяц дэманструюцца кінофільмы. Нядаўна сіламі вучнёўскага драмгуртка была паставлена п'еса «Засада». Настаўніцкі драмгурток рыхтуе п'есу «На заставе».

*Пятнаццаць дырэктароў школ і настаўнікаў, паказаўшых узоры барацьбы за высокую граматнасць і паспяховасць вучняў, прэміраваў полацкі раённы аддзел асветы.

ГУТАРКА ТАВ. ЧАРВЯКОВА АБ ПРАЕКЦЕ КАНСТЫТУЦЫІ БССР

2 лютага ў 7 гадзін вечара ў Доме тэхнікі адбудзецца ГУТАРКА т. ЧАРВЯКОВА АБ ПРАЕКЦЕ КАНСТЫТУЦЫІ БССР з дэпутатамі горсовета, дэлегатамі Усебеларускага З'езда Саветаў і совецкім актывам Кагановіцкага раёна.

Білеты можна атрымаць у РК КП(б)Б. КАГАНОВІЦКІ РК КП(б)Б.

ДЗЕННІК

* Чарговыя заняткі курсаў партыйнага актыва, сакратароў парткомаў і парторгаў адбудуцца 3 лютага ў 6 гадзін вечара ў Вялікай зале Дома партактыва.

* Заняткі гурткоў па гісторыі ВКП(б) і ленінізму адбудуцца 3 лютага ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва (пакоі 21 і 17).

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

БДТ-1 — Як яе завуць, Дзяржаўны яўрэйскі тэатр—Тракіршчыца, «Чырвоная зорка» — На адпачынку, «Пролетарый» — Федзька, «Інтэрнацыянал» — Выпадковая сустрэча, «Спартак» — Златыя горы. Дзіцячы гукавы кінотэатр — Канцэрт Бетховена.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ВЫВЕСІЦЬ НА ВІДНЫМ МЕСЦЫ Ў СЕЛЬСОВЕТАХ, КАЛГАСАХ, СОЎГАСАХ І БРЫГАДАХ

СВІНАЯ СКУРА—КАШТОЎНАЯ СЫРАВІНА ДЛЯ СКУРАНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

З яе вырабляюць абутак, збрую і іншыя скураныя вырабы.

ЗНІМАЙЦЕ СКУРЫ З УСІХ ЗАБІТЫХ І ПАУШЫХ АД НЕЗАРАЗЛІВЫХ ХВАРОБ СВІНЕЙ І ПАРАСЯТ І ЗДАВАЙЦЕ ІХ ДЗЯРЖАЎНЫМ ЗАГАТАВІЦЕЛЯМ.

БЕРАЖЫЦЕ СКУРУ АД ПСАВАННЯ,

ЗА ВЫСОКАГАТУНКОВУЮ СКУРУ ВЫПЛАЧВАЕЦЦА БОЛЬШ ВЫСОКАЯ ЦАНА.

ЛЕПШ ЗА УСЁ ЗАБОІ РАБІЦЬ НА БОЕНСКАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ— тут правільна заб'юць свінню, добра знімуць і закансервуюць скуру.

ПРЫ ЗАБОІ СВІННІ ДОМА, ДЗЕ БОЕНСКАЙ ПЛЯЦОЎКІ НЯМА, ЗАХОЎВАЙЦЕ УСТАНОЎЛЕНЫЯ ПРАВІЛЫ ЗАБОЮ, ЗДЫМКІ І КАНСЕРВІРОЎКІ СКУРЫ.

НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕ СУШЫЦЕ І НЕ ЗАМАРАЖВАЙЦЕ СВІНЫЯ СКУРЫ — ЯНЫ АД ГЭТАГА ПСУЮЦЦА.

1. ЗАБОЙ І АБЯСКРОЎВАННЕ СВІННІ

ПЕРАД ЗАБОЕМ АБМЫЙЦЕ СВІННЮ ЦЁПЛАЙ ВАДОЙ. ЗАБОЙ РАБІЦЕ ЎДАРАМ НАЖА Ў ГОРЛА, АЛЕ НІ Ў ЯКІМ ВЫПАДКУ НЕ Ў СЭРЦА. РАЗРЭЗ НА ГОРЛЕ РАБІЦЕ ПРАДОЛЬНЫ. ПАД МЕСЦА РАЗРЭЗУ ПАДСТАЎЦЕ ТАЗ АБО МІСКУ. АБЯСКРОЎВАННЕ ПАВІННА ПРАЦЯГВАЦЦА 8—10 МІНУТ.

2. ЗНІМАННЕ СКУРЫ

СКУРУ НА ЖЫВАЦЕ СВІННІ РАЗРАЗАЙЦЕ ЗБОКУ—ПА ЛІНІІ САСКОЎ І ЗНІМАЙЦЕ З УСЕЙ ТУШЫ, УКЛЮЧАЮЧЫ ГАЛАВУ І НОГІ. НА ВОКАРАКАХ ЗНІМАЙЦЕ СКУРУ БЕЗ НАЖА. УСТАНАЎЛЯЙЦЕ СТАНКІ ДЛЯ МЕХАНІЧНАЙ ЗДЫМКІ. ПЕРАД ЗНІМАННЕМ ПА СТАНКУ ЗНІМІЦЕ СКУРУ З ГАЛАВЫ. ЖЫВАТА І НОГ СВІННІ.

3. КАНСЕРВАВАННЕ (ЗАСОЛКА)



АСТЫЎШУЮ СВІНУЮ СКУРУ РАССЦЯЛІЦЕ ШЧАЦІНАЙ УНІЗ НА ЧЫСТАЙ ДРАЎЛЯНАЙ ПАДЛОЗЕ АБО НАСЦІЛЕ І ЗАСЫПЦЕ ЧЫСТАЙ СУХОЙ СОЛЛЮ. СОЛІ БЯРЫЦЕ 1/3 ДА ВАГІ СКУРЫ. НА ПЕРШУЮ СКУРУ ПАЛАЖЫЦЕ ДРУГУЮ і т. д. ПРАЗ ДЗЕНЬ-ДВА СКУРЫ СКРУЦІЦЕ Ў ПАКЕТЫ І ДА ЗДАЧЫ ЗАГАТАВІЦЕЛЯМ ХАВАЙЦЕ Ў ЧЫСТЫМ МЕСЦЫ.

ВЫРАБЫ СА СВІНОЙ СКУРЫ

Асмальванне і ашпарванне свіных туш, незалежна ад узросту, забаронена законам

ВЫПІСКА з ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК БССР АД 15 МАЯ 1931 г.

1. Забараніць усім дзяржаўным і кааперацыйным прадпрыемствам і арганізацыям, а таксама прыватным асобам:

а) ашпарванне і асмальванне свіных туш;

б) пераапрацоўку свіных туш для продажу, а таксама і для ўласнага спажывання без папярэдняга зняцця з іх скур.

4. За парушэнне арт. 1 гэтай пастановы вінаватыя прыцягваюцца да адказнасці:

а) службовыя асобы — паводле арт. 196 крым. кодэкса;

б) прыватныя асобы за парушэнне, зробленае ўпершыню, у адміністрацыйным парадку праз накладанне штрафу да 100 руб. паводле пастановы ЦВК і СНК БССР ад 15 мая 1931 г. «Аб абавязковых пастановах раённых выканаўчых камітэтаў і Саветаў аб парадку накладання адміністрацыйных спагнанняў» (З. З. БССР, 1931 г., № 19, паст. № 155), а за парушэнні, зробленыя ў другі раз — да крымінальнай адказнасці паводле арт. 152 крым. кодэкса.

5. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладзі на гарадскія, сельскія і местачковыя саветы і органы міліцыі, а таксама органы ветэрынарнага нагляду пры кляйменні імі свіных туш.

СВІНЫЯ СКУРЫ КУПЛЯЮЦЬ ПА УСТАНОЎЛЕНАЙ ЦАНЕ РАЙЗАГОТКАНТОРЫ, АГЕНТЫ, ЛАРКІ І БОЕНСКІЯ ПЛЯЦОЎКІ САЮЗЗАГОТСКУР, А ТАКСАМА СЕЛЬПО.

САЮЗЗАГОТСКУР.

Уп. Галоўлітбела № К—555. Друкарня газеты «Звязда» Менск Совецкая 63. К. Б. С.